Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека

# РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

## ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ
**19 сакавіка 2006 года**

## Справаздача Місіі БДІПЧ/АБСЕ па назіранні за выбарамі

**Варшава**
**7 чэрвеня 2006 г.**

# ЗМЕСТ


**I. РЭЗЮМЭ ..... 1**

**II. УВОДЗІНЫ І СЛОВЫ ПАДЗЯКІ ..... 4**

**III. ПЕРАДГІСТОРЫЯ ..... 5**

**IV. ПРАВАВАЯ БАЗА ..... 6**

A. Дзеючае заканадаўства ..... 6
B. Ацэнка прававой базы ..... 7

**V. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРАЎ ..... 9**

A. Структура і склад выбарчых органаў ..... 9
B. Ацэнка арганізацыі выбараў ..... 11

**VI. РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ ..... 11**

**VII. РЭГІСТРАЦЫЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ ..... 12**

**VIII. УДЗЕЛ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЯЎ ..... 13**

**IX. УДЗЕЛ ЖАНЧЫН ..... 13**

**X. ПЕРАДВЫБАРНАЯ АГІТАЦЫЯ ..... 14**

A. Агітацыйная дзейнасць ..... 14
B. Павага да грамадзянскіх і палітычных правоў: Роля дзяржаўных органаў ..... 15

**XI. СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ І ВЫБАРЫ ..... 18**

A. Свабода СМІ ..... 18
B. Прававыя рамкі ..... 19
C. Маніторынг СМІ ..... 20

**XII. ЗАЯВЫ І СКАРГІ, ЗВЯЗАНЫЯ З ВЫБАРАМІ ..... 22**

**XIII. МЯСЦОВЫЯ НАЗІРАЛЬНІКІ ЗА ВЫБАРАМІ ..... 23**

**XIV. ГАЛАСАВАННЕ І ПАДЛІК ГАЛАСОЎ ..... 24**

A. Датэрміновае галасаванне, 14-18 сакавіка ..... 24
B. Дзень выбараў, 19 сакавіка ..... 25
C. Падлік галасоў ..... 27
D. Апрацоўка вынікаў галасавання ..... 27

**XV. ЗАЯВЫ І СКАРГІ, ЗРОБЛЕНЫЯ ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ ..... 28**

**XVI. ПАДЗЕІ ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ ..... 29**

**XVII. ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ ..... 30**

**XVIII. РЭКАМЕНДАЦЫІ ..... 30**

A. Прававая база ..... 30
B. Прынцыпы галасавання ..... 31
C. Арганізацыя і правядзенне выбараў ..... 31
D. Рэгістрацыя кандыдатаў ..... 32
E. Рэгістрацыя выбаршчыкаў ..... 32
F. Агітацыя і фінансаванне кампаніі ..... 33
G. СМІ ..... 33
H. Заявы і скаргі ..... 34
I. Галасаванне ..... 34
J. Падлік галасоў і апрацоўка вынікаў галасавання ..... 35
K. Назіранне за выбарамі ..... 35

**ІНФАРМАЦЫЯ АБ БДІПЧ/АБСЕ ..... 37**

**РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ**

**ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ**
**19 сакавіка 2006 г.**

**Выніковая справаздача [1]**

## I. РЭЗЮМЭ

19 студзеня 2006 года Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь накіраваў Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ (БДІПЧ/АБСЕ) запрашэнне правесці назіранне за прэзідэнцкімі выбарамі 19 сакавіка 2006 года. 7 лютага 2006 года БДІПЧ/АБСЕ заснавала Місію па назіранні за выбарамі (МНВ). МНВ БДІПЧ/АБСЕ ацэньвала ступень адпаведнасці прэзідэнцкіх выбараў 2006 года абавязальніцтвам, прынятым на сябе ўсімі дзяржавамі-ўдзельніцамі АБСЕ. У дзень выбараў МНВ БДІПЧ/АБСЕ аб'яднала свае намаганні з Парламенцкай Асамблеяй АБСЕ (ПА АБСЕ) у рамках Міжнароднай місіі па назіранні за выбарамі (ММНВ).

17 лютага для ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах было зарэгістравана чацвёра кандыдатаў: Сяргей Гайдукевіч (Ліберальна-дэмакратычная партыя); Аляксандр Казулін (Сацыял-дэмакратычная партыя «Грамада»); дзеючы Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка (беспартыйны) і Аляксандр Мілінкевіч (беспартыйны). Нягледзячы на тое, што дзякуючы дадзеным кандыдатам у выбаршчыкаў з'явілася магчымасць сапраўднага выбару, у далейшым улады не забяспечылі роўных умоваў для паўнавартаснага суперніцтва. У адносінах да кандыдатаў з боку органаў дзяржаўнай улады вырашальная перавага аддавалася дзеючаму Прэзідэнту Лукашэнку, што паставіла пад сумненне гатовасць уладаў паважаць палітычную канкурэнцыю на аснове роўнасці перад законам і дзяржаўнай уладай.

Супраць кандыдатаў ад апазіцыі адвольным чынам ужывалася дзяржаўная ўлада, што прыводзіла да зрыву іх намаганняў па вядзенню кампаніі. На працягу ўсёй кампаніі ўдзельнікі агітацыйнай работы ад апазіцыі сістэматычна падвяргаліся прыгнёту, затрыманням і арыштам. Прадстаўнікі перадвыбарных штабоў паведамлялі, што з-за прыгнёту з боку дзяржаўных органаў прыцягненне валанцёраў і новых актывістаў з цягам кампаніі станавілася ўсё больш праблематычным.

Не паважаліся гарантаваныя Канстытуцыяй грамадзянскія і палітычныя правы, у тым ліку свабода слова, аб'яднанняў і сходаў, а таксама права на атрыманне, збор і распаўсюджванне інфармацыі. Прынятыя папраўкі ў Крымінальны кодэкс, паводле якіх зараз усталявана крымінальная адказнасць за ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай або ліквідаванай арганізацыі або палітычнай партыі, стварылі для дзяржаўных органаў яшчэ адзін інструмент абмежавання магчымасці чалавека карыстацца сваім правам на аб'яднанне, а таксама запытваць, атрымоўваць і перадаваць меркаванні.

Беларускія электронныя СМІ ўсебакова і ў спрыяльным ключы асвятлялі дзейнасць Прэзідэнта Лукашэнкі. Аб'ём асвятлення поглядаў, якіх прытрымліваліся астатнія кандыдаты, быў вельмі невялікім. Прадастаўленне ўсім кандыдатам у абмежаваным аб'ёме бясплатнага эфірнага часу і друкаванай плошчы было недастаткова для

[1] Дадзеная справаздача была перакладзена на рускую і беларускую мовы. Тым не менш, арыгінал на ангельскай мове застаецца адзіным афіцыйным варыянтам дакумента.

пераадолення няроўнасці ў асвятленні поглядаў. У цэлым адсутнічаў прамы дыялог паміж кандыдатамі, што дадаткова абмежавала магчымасць выбаршчыкаў зрабіць усвядомлены выбар. Дзяржаўныя структуры чынілі перашкоды дзейнасці нешматлікіх незалежных друкаваных СМІ, якія працягваюць працу.

Выбарчы кодэкс абмяжоўвае магчымасць кандыдатаў весці паўнавартасную агітацыю, а выбаршчыкаў – свабодна атрымоўваць інфармацыю, не змяшчае неабходных механізмаў кантролю пры правядзенні выбараў і не забяспечвае неўмяшальніцтва ў працэдуры датэрміновага галасавання і галасавання ў дзень выбараў, падліку галасоў і апрацоўкі вынікаў. Дадзеныя недахопы пагаршаюцца адсутнасцю праяваў палітычнай волі для правядзення выбараў у адпаведнасці з абавязальніцтвамі ў рамках АБСЕ. У цэлым, органы дзяржаўнай улады, улічваючы Цэнтральную камісію па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў (ЦВК), практыкавалі абмежавальнае, а часам і адвольнае ўжыванне заканадаўства.

Разам з тым амаль поўнае недапушчэнне вылучаных апазіцыяй прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій на ўсіх узроўнях прывяло да адсутнасці плюралізму і значна пагоршыла празрыстасць у працы дадзеных органаў. Акрамя таго, кіраўніцтва ЦВК часцяком прымала рашэнні па-за рамкамі афіцыйных паседжанняў ЦВК. Спосаб ужывання заканадаўства пагоршыў недахопы Выбарчага кодэкса і павузіў рамкі для сапраўднага суперніцтва.

Прававыя палажэнні аб парадку падачы і разгляду заяў і скарг, якія адносяцца да выбараў, не забяспечылі эфектыўнага механізма прававой абароны ад процізаконных дзеянняў пры правядзенні выбараў. Нягледзячы на тое, што Кодэксам прадугледжана, што рашэнні ЦВК па асобных пытаннях могуць быць абскарджаны ў Вярхоўны суд, практычнага механізма юрыдычнага апратэставання рашэнняў ЦВК па іншых звязаных з выбарамі пытаннях не існуе. Прынцыпова важна, што падача ў судовым парадку заяў, аспрэчваючых абвешчаныя Цэнтрвыбаркамам вынікі выбараў, з'яўляецца недапушчальнай.

Напярэдадні выбараў спісы выбаршчыкаў былі складзены па кожным участку для галасавання ў асобнасці, так што цэнтралізаваная і даступная для грамадскасці інфармацыя аб колькасці выбаршчыкаў, зарэгістраваных у межах кожнай з тэрытарыяльных адміністратыўных выбарчых структур, адсутнічала. Метад складання спісаў выбаршчыкаў характарызаваўся недастатковай празрыстасцю і не забяспечыў іх дакладнасці. Крыжаванай праверкі спісаў з мэтай выяўлення магчымых шматразовых запісаў, мяркуючы па ўсім, не праводзілася.

Безадносна дадзеных істотных недахопаў падрыхтоўка да выбараў праводзілася Цэнтрвыбаркамам, тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі (ТВК) і ўчастковымі выбарчымі камісіямі (УВК) у цэлым эфектыўна. Напярэдадні выбараў Цэнтрвыбаркам і значная большасць тэрытарыяльных і ўчастковых камісій прадастаўлялі назіральнікам інфармацыю, якую запытвалі апошнія. Тым не менш, некаторыя палажэнні Выбарчага кодэкса былі скарыстаныя выбарчымі органамі для абмежавання законнай наглядальніцкай дзейнасці і павузілі рамкі для паўнавартаснага назірання з боку міжнародных і мясцовых назіральнікаў.

Нягледзячы на тое, што па інфармацыі ЦВК тэрытарыяльныя і ўчастковыя камісіі зарэгістравалі каля 32 000 мясцовых назіральнікаў, большасць з іх былі вылучаны ад

працоўных калектываў і арганізацый, якія ў цэлым падтрымліваюць дзеючага Прэзідэнта. Маштаб назірання з боку мясцовых незалежных непартыйных назіральнікаў быў абмежаваным. 21 лютага органы дзяржаўнай службы бяспекі (КДБ) арыштавалі лідэраў незарэгістраванай грамадзянскай ініцыятывы «Партнёрства», якая на мінулых выбарах каардынавала работу груп мясцовых незалежных назіральнікаў, выставіўшы тысячы назіральнікаў.

Датэрміновае галасаванне ў перыяд з 14 па 18 сакавіка прайшло ў адсутнасці неабходнай празрыстасці, што знізіла ўпэўненасць у адсутнасці ўмяшальніцтва ў дадзеную стадыю выбарчага працэсу. Выбарчы кодэкс не абавязвае весці ўлік колькасці выбаршчыкаў, якія прагаласавалі ў кожны з дзён датэрміновага галасавання, або ўносіць у афіцыйны пратакол агульную колькасць «датэрміновых галасоў». Акрамя таго, належным чынам не забяспечваецца недатыкальнасць скрыняў для галасавання ў начныя гадзіны сутак. МНВ БДІПЧ/АБСЕ атрымоўвала паведамленні аб тым, што кіраўніцтва кампаній і дырэктары навучальных устаноў аддавалі сваім супрацоўнікам і студэнтам указанне прагаласаваць датэрмінова, пагражаючы ў адваротным выпадку негатыўнымі наступствамі. Па дадзеных ЦВК да 19 сакавіка прагаласаваў 31 працэнт выбаршчыкаў.

17 сакавіка кандыдаты ад апазіцыі А.Казулін і А.Мілінкевіч выступілі з сумеснай заявай, у якой выказалі свой недавер да ЦВК у сувязі з «грубымі парушэннямі Канстытуцыі і шэрагу заканадаўчых актаў, якія маюць дачыненне да выбараў», запатрабавалі прызначыць новы склад ЦВК і адкласці выбары да ліпеня. Зробленыя напярэдадні выбараў заявы КДБ аб дачыненні апазіцыі да падрыхтоўкі сілавога захопу ўлады ў дзень выбараў паспрыялі стварэнню нявызначанага і ўціскальнага палітычнага становішча.

Галасаванне 19 сакавіка прайшло ў спакойнай і мірнай атмасферы. Увогуле арганізацыя галасавання пакінула добрае ўражанне, а ўчастковыя камісіі і выбаршчыкі дэманстравалі добрае валоданне працэдурамі галасавання. Агульная ацэнка правядзення галасавання была станоўчай у 90 працэнтах справаздач аб назіранні. Пры гэтым 10 працэнтаў назіральнікаў паведамілі аб перашкодах, якія чыніліся ім пры ажыццяўленні наглядальніцкай дзейнасці. Былі таксама адзначаны сур'ёзныя недахопы: парушэнні таямніцы галасавання; аказанне ціску на выбаршчыкаў; групавое галасаванне; прысутнасць на ўчастках для галасавання неўпаўнаважаных асобаў; відавочна ідэнтычныя роспісы ў спісах выбаршчыкаў і прыкметы шматразовага галасавання.

Якасць выбарчага працэсу пагоршылася пры падліку галасоў, які часцяком праходзіў без прытрымлівання мінімальных крытэраў празрыстасці. У 50 працэнтах справаздач назіральнікі далі працэдуры падліку галасоў негатыўную ацэнку. Сярод парушэнняў адзначалася: невыкананне ўсталяванай працэдуры, прысутнасць неўпаўнаважаных асобаў, неналежны разгляд скарг і маніпуляцыі з пратаколам аб выніках галасавання. Амаль 70 працэнтаў участковых камісій не аб'яўлялі колькасць галасоў, пададзеных за кожнага з кандыдатаў, да складання пратаколаў.

Нягледзячы на запэўненні, што назіральнікі змогуць сачыць за апрацоўкай вынікаў галасавання па выбарчых участках тэрытарыяльнымі камісіямі, у 39 працэнтах назіранняў назіральнікі, якія меліся прасачыць за дадзеным этапам выбарчага працэсу, сутыкаліся з абмежаваннямі і нават перашкодамі. У шэрагу выпадкаў ім было

адмоўлена ў дазволе прайсці ў памяшканне тэрытарыяльнай камісіі. У 43 працэнтах справаздач аб назіранні празрыстасць працэдуры апрацоўкі вынікаў атрымала ацэнку «дрэнная» або «вельмі дрэнная».

Увечары дня выбараў А.Казулін і А.Мілінкевіч выступілі на мітынгу ў цэнтры Мінска, заявіўшы, што выбары былі сфальсіфікаваныя і не адлюстроўваюць волевыяўлення народа. Яны запатрабавалі правядзення дэмакратычных выбараў 16 ліпеня 2006 года. Нягледзячы на тое, што першыя пяць дзён улады дазвалялі працягваць дадзеную акцыю, супрацоўнікі міліцыі сістэматычна затрымоўвалі пратэстуючых пры сыходзе з месца правядзення мітынгу і вяртанні на яго і, па паведамленнях, перашкаджалі людзям прыносіць пратэстуючым прадукты, цёплую вопратку і коўдры. Нягледзячы ні на што, многія ўдзельнікі акцыі працягвалі пратэставаць, пакуль самай раніцай 24 сакавіка супрацоўнікі міліцыі не разагналі дэманстрацыю і не арыштавалі застаўшыхся яе ўдзельнікаў. На працягу тыдня пасля выбараў у сувязі з масавымі пратэстамі было затрымана ад 500 да 1000 чалавек, у тым ліку і А.Казулін.

23 сакавіка ЦВК разгледзела заявы, пададзеныя А.Казуліным і А.Мілінкевічам, з патрабаваннем прызнаць выбары несапраўднымі. Абедзве скаргі былі адхіленыя. Затым яны паспрабавалі аспрэчыць вынікі выбараў у Вярхоўным судзе. 5 красавіка суд прызнаў дадзеныя апеляцыі не падлягаючымі разгляду. БДІПЧ/АБСЕ ў прысутнасці на дадзеным паседжанні было адмоўлена.

Правядзенне прэзідэнцкіх выбараў 2006 года ў Беларусі не адпавядала абавязальніцтвам у рамках АБСЕ ў сферы дэмакратычных выбараў. У прыватнасці, цалкам або часткова не былі выкананыя параграфы 5.4, 7.3, 7.4, 7.6, 7.7, 7.8, 10.1 і 10.3 Капенгагенскага дакумента 1990 года.

БДІПЧ/АБСЕ пацвярджае сваю гатовасць аказваць падтрымку намаганням Рэспублікі Беларусь па правядзенні выбараў у адпаведнасці з абавязальніцтвамі ў рамках АБСЕ і іншымі міжнароднымі стандартамі.

## II. УВОДЗІНЫ І СЛОВЫ ПАДЗЯКІ

19 студзеня 2006 года Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь накіраваў Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ (БДІПЧ/АБСЕ) запрашэнне правесці назіранне за прэзідэнцкімі выбарамі 19 сакавіка 2006 года. 24 студзеня БДІПЧ/АБСЕ накіравала ў Беларусь Ацэначную місію (ОМ), пасля чаго, 7 лютага 2006 года, была разгорнута Місія БДІПЧ/АБСЕ па назіранні за выбарамі (МНВ). МНВ БДІПЧ/АБСЕ ўзначаліў амбасадар Герт Хінрых Арэнс (Нямеччына). У склад МНВ увайшла асноўная група з 14 экспертаў па пытаннях выбараў і адміністратыўны персанал, якія размяшчаліся ў Мінску, і 38 доўгатэрміновых назіральнікаў (ДТН), размешчаных 16 лютага ў Мінску і 14 іншых гарадах.

Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь запрасіў накіраваць сваіх назіральнікаў Парламенцкую Асамблею АБСЕ (ПА АБСЕ). Дзеючы Старшыня АБСЕ і Міністр замежных спраў Каралеўства Бельгія Карэл дэ Гюхт прызначыў Прэзідэнта ПА АБСЕ, кангрэсмена Элсі Л. Хастынгса (Злучаныя Штаты Амерыкі) спецыяльным каардынатарам кароткатэрміновага назірання

У дзень выбараў МНВ БДІПЧ/АБСЕ аб'яднала намаганні з ПА АБСЕ ў рамках Міжнароднай місіі па назіранні за выбарамі (ММНВ). ММНВ выставіла 546 кароткатэрміновых назіральнікаў, у тым ліку 439 назіральнікаў, дэлегаваных у склад МНВ БДІПЧ/АБСЕ дзяржавамі-ўдзельніцамі АБСЕ[2] і 96 парламентарыяў[3] ПА АБСЕ, а таксама 11 афіцыйных асобаў ПА АБСЕ і парламенцкіх супрацоўнікаў. Назіральнікі былі набраныя з 38 дзяржаў-удзельніц АБСЕ. Назіральнікі даслалі 231 справаздачу аб назіранні ў дзень выбараў за працэдурамі адкрыцця ўчасткаў для галасавання, 2395 справаздач аб ходзе галасавання, 229 справаздач аб ходзе падліку галасоў на ўзроўні выбарчых участкаў і 104 формы справаздачы аб ходзе апрацоўкі вынікаў тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі (ТВК). Да дня выбараў назіральнікі даслалі агульным чынам 2022 справаздачы, якія ахоплівалі перыяд датэрміновага галасавання.

Дадзеная выніковая справаздача была падрыхтавана ўслед за апублікаваннем Папярэдніх заключэнняў і высноваў ММНВ на прэс-канферэнцыі 20 сакавіка, публікацыяй двух прамежкавых справаздач БДІПЧ/АБСЕ падчас работы місіі і справаздачы Ацэначнай місіі БДІПЧ/АБСЕ 31 студзеня. Са ўсімі дадзенымі дакументамі можна азнаёміцца на сайце www.osce.org/odihr. БДІПЧ/АБСЕ раней праводзіла назіранне за шэрагам выбараў у Беларусі, у тым ліку ў рамках Місіі па абмежаваным назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі 2001 года і Місіі па тэхнічнай ацэнцы парламенцкіх выбараў 2000 года.

МНВ БДІПЧ/АБСЕ выказвае сваю ўдзячнасць Міністэрству замежных спраў, Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК) і іншым нацыянальным і мясцовым органам улады за аказаную дапамогу і праяўленае супрацоўніцтва. Разам з тым місія са шкадаваннем канстатуе, што шэраг асоб з ліку яе мясцовых асістэнтаў падвергнуліся падчас працы у складзе МНВ БДІПЧ/АБСЕ запалохванню. МНВ удзячна Офісу АБСЕ ў Мінску за аказаную падтрымку.

## III. ПЕРАДГІСТОРЫЯ

Аб правядзенні прэзідэнцкіх выбараў 19 сакавіка было абвешчана 16 снежня 2005 года. Нягледзячы на тое, што выбары павінны былі быць праведзены не пазней ліпеня 2006 года, яны былі прызначаны прыблізна на чатыры месяцы раней. Дадзеная кампанія стала трэцімі прэзідэнцкімі выбарамі, якія адбыліся з часу здабыцця Беларуссю незалежнасці ў 1991 годзе. Дзеючы Прэзідэнт, Аляксандр Лукашэнка, атрымаў дазвол балатавацца на трэці тэрмін пасля правядзення 17 кастрычніка 2004 года рэферэндуму, які зняў канстытуцыйнае абмежаванне прэзідэнцкага мандата двума тэрмінамі. БДІПЧ/АБСЕ асобнага назірання за рэферэндумам 2004 года не праводзіла, аднак правяло назіранне за праходзіўшымі адначасова з ім парламенцкімі выбарамі 2004 года. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (у рэдакцыі 1996 года) надзяляе Прэзідэнта шырокімі паўнамоцтвамі без выразнага падзелу ўлады паміж дзяржаўнымі органамі[4]. Паводле Канстытуцыі колькасць склікання заканадаўчага органа абмяжоўваецца дзвюма сесіямі штогод працягласцю агульным чынам не больш за 170 дзён. Дэкрэты

---

[2] Васьмі кароткатэрміновым назіральнікам БДІПЧ/АБСЕ не былі выдадзены візы або было адмоўлена ва ўездзе ў краіну.

[3] Дзевятнаццаці членам дэлегацыі ПА АБСЕ не былі выдадзены візы або было адмоўлена ва ўездзе ў Беларусь.

[4] Паводле Венецыянскай камісіі Савета Еўропы, Канстытуцыя Беларусі прадугледжвае «празмерныя паўнамоцтвы Прэзідэнта без належных стрымак і проціваг». Страсбург, 8 кастрычніка 2004 года.

Прэзідэнта, выдадзеныя ў той час, калі не працуе сесія заканадаўчага органа, маюць сілу законаў. Калі закон уступае ў супярэчнасць з дэкрэтам Прэзідэнта, дэкрэт, як правіла, мае пераважную сілу[5].

Нягледзячы на тое, што з часу ўтварэння партыі «Беларускі народны фронт» у 1988 годзе ў Беларусі быў заснаваны цэлы шэраг палітычных партый, дзяржава не стварыла ўмоваў, якія б спрыялі сапраўднаму палітычнаму плюралізму. Большасць партый і палітычных арганізацый маюць слабыя арганізацыйныя структуры і адыгрываюць невялікую ролю ў грамадскім жыцці. За апошнія гады рэгіянальныя структуры некаторых апазіцыйных партый былі пазбаўлены рэгістрацыі і зачынены па прычыне неадпаведнасці заканадаўчаму патрабаванню аб перарэгістрацыі пад «юрыдычным адрасам». Па выніках парламенцкіх выбараў 2004 года апазіцыйныя палітычныя партыі не атрымалі свайго прадстаўніцтва ў 110-мясцовым Нацыянальным сходзе[6].

Цягам апошніх год абмяжоўвалася і звужалася сфера дзейнасці НУА і грамадзянскіх ініцыятываў. У 2003 годзе былі прыняты пастановы аб скасаванні рэгістрацыі 51 НУА, у 2004 годзе - 38 НУА, а ў 2005 годзе рэгістрацыі былі пазбаўлены 68 НУА. У той жа час стала нашмат складаней зарэгістраваць новае НУА. Па інфармацыі Міністэрства юстыцыі ў 2005 годзе ім было атрымана 1 284 заяўкі на рэгістрацыю НУА, з якіх была здаволена толькі 61.

# IV. ПРАВАВАЯ БАЗА

## A. ДЗЕЮЧАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА

Асноўныя палажэнні аб выбарах змешчаны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (у рэдакцыі 1996 года). Галоўным актам, які рэгламентуе правядзенне выбараў, з'яўляецца Выбарчы кодэкс (ад 2000 года). На ход выбарчага працэсу аказвае ўплыў шэраг іншых прававых актаў, у тым ліку Кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях, Крымінальны кодэкс, закон «Аб масавых мерапрыемствах», закон «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» і пастановы ЦВК.

Паводле Канстытуцыі і Выбарчага кодэкса для прызнання прэзідэнцкіх выбараў адбыўшыміся павінна прагаласаваць 50 працэнтаў выбаршчыкаў, уключаных у спісы. Каб быць абраным, кандыдату-пераможцу неабходна набраць больш за палову ўсіх пададзеных галасоў. Калі ніводны з кандыдатаў не здолее атрымаць перамогу на выбарах, то не пазней чым у двухтыднёвы тэрмін праводзіцца другі тур галасавання па кандыдатах, якія атрымалі найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў, на які таксама распаўсюджваецца патрабаванне яўкі. Кандыдату-пераможцу патрабуецца атрымаць большасць усіх пададзеных галасоў, улічваючы «несапраўдныя бюлетэні» і галасы «супраць усіх». Такім чынам, існуе магчымасць непрызнання выбараў з

[5] Артыкулам 137 Канстытуцыі прадугледжана, што «у выпадку разыходжання дэкрэта або ўказа з законам закон мае вяршэнства толькі тады, калі паўнамоцтвы на выданне дэкрэта або ўказа былі прадстаўлены законам».

[6] У Нацыянальным сходзе маюць прадстаўніцтва толькі тры партыі: Камуністычная партыя (8 месцаў), Аграрная партыя (3 месцы) і Ліберальна-дэмакратычная партыя (1 месца), пры гэтым ніводная з іх не знаходзіцца ў апазіцыі да Прэзідэнта. Астатнія 98 месцаў займаюць удзельнікі парламенцкіх выбараў 2004 года, якія не маюць дачынення ні да адной з палітычных партый.

прававога пункта гледжання «адбыўшыміся» у тых выпадках, калі не выканана патрабаванне яўкі.

## B. АЦЭНКА ПРАВАВОЙ БАЗЫ

БДІПЧ/АБСЕ ўжо некалькі разоў праводзіла падрабязны аналіз Выбарчага кодэкса, а ў папярэдніх справаздачах Бюро аб выбарах былі адзначаны яго шматлікія і істотныя недахопы[7]. Выбарчы кодэкс абмяжоўвае грамадзянскія і палітычныя правы, не змяшчае дастатковых гарантый палітычнага плюралізму і празрыстасці і не забяспечвае неўмяшальніцтва ў працэдуру датэрміновага галасавання, галасавання ў дзень выбараў, падліку галасоў і апрацоўкі вынікаў. Нягледзячы на прапанаваныя рэкамендацыі па прывядзенні Кодэкса ў больш блізкую адпаведнасць з абавязальніцтвамі ў рамках АБСЕ адносна правядзення дэмакратычных выбараў[8], да цяперашняга часу беларускія ўлады гатовасці разгледзець іх не дэманстравалі. З 2000 года якіх-небудзь істотных паправак у Выбарчы кодэкс не ўносілася. Выкананне Кодэкса яшчэ ў большай ступені падарвала магчымасці для заканадаўчага забеспячэння выбарчага працэсу адпаведна з абавязальніцтвамі ў рамках АБСЕ.

Выбарчым кодэксам не закладваецца дастатковай базы для свабоднага і добрасумленнага вядзення агітацыі. Нягледзячы на тое, што ў Кодэксе не змешчана прама выказаных забаронаў адносна вядзення агітацыі, паводле тлумачэння заканадаўства Цэнтрвыбаркамам кандыдаты мелі права займацца толькі вызначанымі формамі агітацыі: выкарыстаць бясплатны эфірны час і друкаваную плошчу ў дзяржаўных СМІ, арганізоўваць сустрэчы з выбаршчыкамі і распаўсюджваць вызначаныя віды друкаваных агітацыйных матэрыялаў[9]. Па заканадаўстве дзяржаўныя органы абавязаны прадаставіць кандыдатам грашовыя сродкі на выраб друкаваных агітацыйных матэрыялаў[10]. На выбарах 2006 года кожнаму з кандыдатаў на гэтыя мэты было прадастаўлена 66700000 беларускіх рублёў (прыкладна 31000 даляраў ЗША).

Нягледзячы на тое, што Выбарчым кодэксам фінансаванне перадвыбарнай кампаніі з недзяржаўных крыніц прама не абмяжоўваецца, артыкулам 48 кодэкса забараняецца «матэрыяльная дапамога пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў». ЦВК тлумачыла дадзены артыкул такім чынам, што кандыдатам не дазваляецца выкарыстоўваць уласныя прыватныя грашовыя сродкі і прамыя ахвяраванні для фінансавання сваёй перадвыбарнай кампаніі, а фінансаванне іх перадвыбарнай кампаніі абмяжоўваецца выключна сумай, прадастаўленай дзяржавай (г.зн. прыкладна 31000 даляраў ЗША). Кандыдатам не дазвалялася выкарыстаць прадастаўленыя дзяржавай грашовыя сродкі для арэнды плошчы на рэкламных шчытах. За парушэнні палажэнняў Выбарчага кодэкса аб парадку вядзення агітацыі кандыдаты маглі быць пазбаўлены рэгістрацыі.

---

7 Гл. «Ацэнка Выбарчага кодэкса Беларусі БДІПЧ/АБСЕ", 25 ліпеня 2000 г.; «Выніковая справаздача БДІПЧ/АБСЕ аб парламенцкіх выбарах 2004 года», 9 снежня 2004 года, «Выніковая справаздача БДІПЧ/АБСЕ аб прэзідэнцкіх выбарах 2001 года», 4 кастрычніка 2001 года на сайце: www.osce.org/odihr.

8 там жа.

9 Сярод іншага, да дазволеных друкаваных матэрыялаў аднесены перадвыбарныя плакаты, лісткі, фотаматэрыялы і т.д. Змест дадзеных матэрыялаў павінен адпавядаць палажэнням артыкула 47 Кодэкса.

10 Дадзеныя грашовыя сродкі знаходзяцца ў кіраванні Цэнтрвыбаркама. Кандыдаты размяшчаюць замовы на выраб матэрыялаў і прад'яўляюць у ЦВК расходныя чэкі, якія аплачваюцца Цэнтрвыбаркамам.

У дачыненні да агітацыйных мерапрыемстваў ужываўся закон «Аб масавых мерапрыемствах» (у рэдакцыі ад 1997 года), які прадугледжвае розныя віды публічных сходаў. Дадзены закон накладае абмежаванні на свабоду публічных сходаў, напрыклад у выглядзе патрабавання аб накіраванні папярэдняй заяўкі на правядзенне публічнага мерапрыемства за 15 дзён да яго прапануемай даты, што дазваляе мясцовым органам улады прымаць рашэнне аб тым, ці санкцыянаваць публічнае (агітацыйнае) мерапрыемства, і нават змяняць час і месца яго правядзення. Папярэдняе накіраванне такой заяўкі за 15 дзён з'яўляецца празмерна доўгім тэрмінам, асабліва ва ўмовах перадвыбарнай кампаніі, якая праходзіла за адносна кароткі перыяд часу. Цэнтрвыбаркам паведамляў МНВ БДІПЧ/АБСЕ аб тым, што 15-дзённы тэрмін папярэдняга апавяшчэння, патрабаваны па законе для правядзення сустрэч у памяшканнях, у перыяд агітацыі ўжывацца не будзе. Аднак дзяржаўныя органы ўсё ж ужывалі Закон да перадвыбарных агітацыйных мерапрыемстваў на адчыненым паветры. Паступаючы такім чынам, яны фактычна палічылі, што палажэнні Закона маюць перавагу над Выбарчым кодэксам[11], адмаўляючы кандыдатам у правах, прадастаўленых ім паводле артыкула 45 Выбарчага кодэкса. Парушэнні палажэнняў Закона «Аб масавых мерапрыемствах» уяўляюць сабою адміністратыўныя правапарушэнні, якія прадугледжваюць пакаранне да 15 сутак адміністратыўнага арышту.

Выбарчым кодэксам прызнаецца роля назіральнікаў на выбарах, а ў артыкуле 13 Выбарчага кодэкса змешчаны шэраг агульных палажэнняў, закліканых забяспечыць галоснасць пры правядзенні выбараў. Кодэксам прадугледжана назіранне з боку міжнародных і мясцовых назіральнікаў партыйнымі і непартыйнымі арганізацыямі. Тым не менш, шэраг яго палажэнняў можа выкарыстоўвацца для абмежавання законнай наглядальніцкай дзейнасці і павузіць рамкі паўнавартаснага назірання за выбарчым працэсам. Тым жа артыкулам назіральніку забараняецца «знаходзіцца ля сталоў выдачы бюлетэняў…». Сярод іншага, гэтая забарона абмяжоўвае магчымасць назіральнікаў правяраць, ці прад'яўляюць выбаршчыкі належныя дакументы, якія пасведчаюць асобу, уважліва знаёміцца са спісам выбаршчыкаў і выразна бачыць, колькі бюлетэняў было выдадзена выбаршчыкам. На этапе падліку галасоў дадзенае палажэнне таксама выкарыстоўвалася для недапушчэння знаходжання назіральнікаў на досыць блізкай адлегласці для праверкі празрыстасці ажыццяўлення працэдур падліку галасоў[12].

Кодэкс не змяшчае дастатковых гарантый забеспячэння неўмяшальніцтва ў працэдуру галасавання, падліку галасоў і падвядзення вынікаў. У ім не змешчана досыць падрабязнае апісанне працэдур падліку галасоў, у выніку чаго працэс падліку галасоў здзяйсняецца УВК бессістэмным і непаслядоўным чынам. Адсутнасць у Кодэксе патрабавання да УВК аб'яўляць або дэманстраваць падчас падліку галасоў, за каго з кандыдатаў аддаў свой голас выбаршчык, уяўляе сабою сур'ёзны недахоп, які можа паставіць пад сумненне неўмяшальніцтва ў працэс падліку галасоў.

Артыкулам 53 Кодэкса прадугледжваецца правядзенне на працягу пяці дзён да дня выбараў «датэрміновага галасавання». Патрабаванне, каб выбаршчык адзначыў у спісе выбаршчыкаў пры атрыманні свайго бюлетэня дату галасавання, адчыняе магчымасці

[11] 9 сакавіка дадзенае юрыдычнае тлумачэнне прыняла Старшыня ЦВК.

[12] Параграфам 7.4. Капенгагенскага дакумента АБСЕ прадугледжана, што дзяржавы-ўдзельніцы «забяспечваюць, каб падлік галасоў і паведамленне аб ім былі сумленнымі, а афіцыйныя вынікі былі апублікаваны».

для прымусу выбаршчыкаў да датэрміновага галасавання. У дадзены перыяд галасаванне праводзіцца ўсяго двума членамі УВК. Заканадаўства не абавязвае весці ўлік колькасці выбаршчыкаў, якія прагаласавалі ў кожны з дзён датэрміновага галасавання, або ўносіць у афіцыйны пратакол агульную колькасць «датэрміновых галасоў» у якасці асобнай графы. У перыяд датэрміновага галасавання належным чынам не забяспечваецца недатыкальнасць скрынь для бюлетэняў у начныя гадзіны сутак, што павялічвае магчымасць электаральных парушэнняў. Дадзеныя фактары пагаршаюць празрыстасць працэсу датэрміновага галасавання і зніжаюць давер да яго сумленнасці.

Рэгламентацыя парадку галасавання з выкарыстаннем пераносных скрыняў з'яўляецца настолькі ж залішне ліберальнай, дапушчаючы, каб выбаршчык звяртаўся з просьбай аб наведванні членамі УВК па месцы знаходжання ў выпадках, калі ён або яна не могуць прыйсці ў памяшканне для галасавання (Артыкул 54.1-2). Больш таго, вусная просьба аб галасаванні з дапамогай пераноснай скрыні можа паступіць ад любой іншай асобы ажно да 6 гадзін вечара дня выбараў. Двое членаў камісіі наносяць візіт са спецыяльна складзеным спісам, падрыхтаваным старшынёй або сакратаром. У некаторых сельскіх рэгіёнах пасродкам выкарыстання пераносных скрыняў прагаласавала значная частка выбаршчыкаў.

У 2005 годзе былі ўнесены папраўкі ў Крымінальны кодэкс (ад 1999 года). Сярод іншага, у яго былі ўключаны новыя палажэнні, якія абмяжоўваюць дзейнасць НУА і грамадзянскіх ініцыятываў. Напрыклад, артыкул 193[1] класіфікуе ўдзел у дзейнасці незарэгістраванага або ліквідаванага грамадскага аб'яднання або палітычнай партыі як крымінальнае правапарушэнне, якое караецца ажно да пазбаўлення свабоды тэрмінам да двух гадоў. Дадзеныя фактары абмежавалі магчымасць грамадзяніна карыстацца сваім правам аб'яднання, а таксама ўтвараць і актыўна ўдзельнічаць у дзейнасці НУА. Гэта ўшчамляе права грамадзяніна свабодна запытваць, атрымоўваць і перадаваць меркаванні, што прадугледжана параграфамі 10.1 і 10.3 Капенгагенскага дакумента АБСЕ. Паводле іншых палажэнняў Крымінальнага кодэкса крымінальным правапарушэннем прызнаецца «дыскрэдытацыя Беларусі перад міжнароднай арганізацыяй або замежнай дзяржавай» і абраза і паклёп у адрас Прэзідэнта і асобных прадстаўнікоў улады. Такія палажэнні ўшчамляюць права грамадзян на свабоду слова.

# V. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРАЎ

## A. СТРУКТУРА І СКЛАД ВЫБАРЧЫХ ОРГАНАЎ

Правядзеннем прэзідэнцкіх выбараў займаліся Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў (ЦВК), 165 тэрытарыяльных выбарчых камісій (ТВК) і 6 586 участковых выбарчых камісій (УВК)[13], у тым ліку камісіі 41 выбарчага ўчастку, заснаванага ў дыпламатычных місіях Рэспублікі Беларусь за мяжой для галасавання па-за тэрыторыяй краіны.

ЦВК з'яўляецца органам, які працуе на сталай аснове; пяцігадовы тэрмін яе мандата скончыцца ў студзені 2007 года. У яе склад уваходзяць 12 членаў, шэсць з якіх

13 Склад ЦВК быў прызначаны ў адпаведнасці з палажэннямі Закона «Аб Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў», тэрытарыяльных і ўчастковых камісій - у адпаведнасці з палажэннямі Выбарчага кодэкса.

прызначаюцца Прэзідэнтам і шэсць – абіраемым непрамым чынам Саветам Рэспублікі (верхняй палатай Парламента). Старшыня, сакратар і загадчык арганізацыйна-прававога аддзела займаюцца арганізацыяй выбараў на прафесійнай аснове. Астатнія дзевяць членаў ЦВК удзельнічаюць у яе працы па сумяшчальніцтве з выкананнем службовых абавязкаў па іншым месцы працы. Намеснік старшыні ЦВК узначальваў Нацыянальны цэнтр законапраектнай дзейнасці, аднак пакінуў свой пост 1 лютага; яшчэ адзін з членаў камісіі займае пасаду Намесніка Міністра юстыцыі.

ТВК можна суаднесці з адміністратыўным дзяленнем дзяржавы на ўзроўнях ніжэй за агульнанацыянальны. Такім чынам, было створана сем «абласных» выбарчых камісій, шэсць «гарадскіх» выбарчых камісій (якія ўтвараюцца ў асноўным у рэгіянальных цэнтрах) і 152 «раённыя» выбарчыя камісіі. У асноўным, у склад кожнай з ТВК увайшло па 13 членаў. Члены ў склад ТВК маглі вылучацца шырокім спектрам арганізацый, у тым ліку: грамадскімі аб'яднаннямі, працоўнымі калектывамі, палітычнымі партыямі і самавылучэннем асобных выбаршчыкаў, падтрыманым грамадзянамі.

Члены ТВК былі прызначаны на сумесных паседжаннях мясцовых заканадаўчых і выканаўчых органаў, праведзеных да 28 снежня 2005 года ўключна. З 2124 прызначаных членаў 44,8 працэнта прыйшлося на самавылучэнцаў. Працоўныя калектывы вылучылі 23,4 працэнта прызначаных членаў і яшчэ 9,6 працэнта членаў склалі службоўцы мясцовых органаў кіравання. Вылучэнцы ад палітычных партый склалі ўсяго 2,6 працэнта членаў ТВК. З іх 47 былі вылучаны Камуністычнай партыяй Беларусі, якая аказвае палітычную падтрымку Прэзідэнту Лукашэнку. Астатнія члены ТВК былі вылучаны грамадскімі аб'яднаннямі. Нягледзячы на тое, што адносна размеркавання месцаў у складзе ТВК і УВК не існуе ніякай формулы, роля мясцовых заканадаўчых і выканаўчых органаў у прызначэнні членаў камісій прывяла да значнага кантролю над выбарчымі органамі з іх боку.

Прызначаўшыя органы канчаткова зацвердзілі склад УВК да ўсталяванага на 1 лютага крайняга тэрміну ўключна. Нягледзячы на тое, што адбор членаў у склад УВК прадугледжаны Кодэксам на канкурэнтнай аснове з магчымасцю выбару, у шэрагу выпадкаў працэдура іх прызначэння сведчыла аб зваротным, характарызуючыся недастатковай празрыстасцю і аднастайнасцю. МНВ БДІПЧ/АБСЕ склала выбарку з 18 ТВК, у склад якіх увайшло 740 УВК. МНВ усталявала, што колькасць прызначаных членаў УВК была вельмі блізкай да колькасці пададзеных заявак. З дадзеных ТВК вынікала, што на 8540 вакансій было пададзена 8662 заяўкі. Часцяком мясцовыя органы выканаўчай улады ўскладаюць абавязкі па правядзенню выбараў на кіраўнікоў дзяржаўных установаў.

Часта члены адной УВК з'яўляліся супрацоўнікамі адной і той жа ўстановы, а старшыня камісіі прыходзіўся ім начальнікам або працадаўцам. Некаторыя палітычныя партыі і НУА паведамілі назіральнікам МНВ аб тым, што хоць яны падавалі заяўкі на вылучэнне сваіх прадстаўнікоў у склад УВК, дадзеныя заяўкі не прымаліся. Па інфармацыі, атрыманай у ЦВК, толькі 0,2 працэнта членаў УВК былі вылучаны ад адной з палітычных партый, тады як іх большасць склалі грамадзяне, вылучаныя шляхам падачы заявы (49,3%) альбо ж ад працоўных калектываў (35,4 працэнта). 5% членаў УВК склалі службоўцы мясцовых органаў кіравання, а астатнія члены былі вылучаны ад грамадскіх аб'яднанняў.

### B. АЦЭНКА АРГАНІЗАЦЫІ ВЫБАРАЎ

Безадносна недахопаў, дапушчаных пры фармаванні і працы выбарчых органаў, прыгатаванні да выбараў праводзіліся Цэнтрвыбаркам, ТВК і УВК увогуле эфектыўна. Цэнтрвыбаркамам былі захаваны ўсталяваныя заканадаўствам тэрміны.

У передвыбарны перыяд ЦВК, пераважная большасць ТВК і УВК прадастаўлялі назіральнікам інфармацыю, якую яны запытвалі. Нягледзячы на тое, што Выбарчым кодэксам прама не прадугледжана прадастаўленне ўсіх дакументаў па выбарах для ўсеагульнага азнаямлення, ЦВК публікавала большасць сваіх рашэнняў і вяла вэб-сайт, дзе размяшчаліся дакументы. Тым не менш, некаторая базавая інфармацыя, улічваючы колькасць зарэгістраваных выбаршчыкаў у межах кампетэнцыі кожнай ТВК напярэдадні выбараў, колькасць аддрукаваных і выдадзеных бюлетэняў, а таксама парадак выкарыстання «запасных» бюлетэняў, была недаступная для грамадскасці.

Амаль поўнае недапушчэнне вылучаных апазіцыяй прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій на ўсіх узроўнях прывяло да адсутнасці плюралізму і значна пагоршыла празрыстасць у працы дадзеных органаў. Назіральнікі МНВ БДІПЧ/АБСЕ таксама мелі падставы паставіць пад сумненне іх незалежнасць ад дзяржаўных органаў выканаўчай улады. Шмат з іх паведамлялі аб тым, што мясцовыя органы кіравання, якія прынцыпова не могуць удзельнічаць у правядзенні выбараў, аказвалі значны ўплыў на рашэнні камісій. Мясцовыя назіральнікі таксама набіраліся з ліку прадстаўнікоў мясцовых органаў кіравання.

Паседжанні камісій усіх узроўняў былі адчыненымі для наведвання назіральнікаў, прадстаўнікоў зарэгістраваных кандыдатаў[14] і СМІ. Тым не менш, ЦВК правяла ўсяго два паседжання - для рэгістрацыі кандыдатаў і іх даверанных асобаў 17 лютага і аб'явы вынікаў выбараў 23 сакавіка. Старшыня ЦВК і сакратар часцяком прымалі рашэнні адміністратыўнага і прававога характару па-за рамкамі афіцыйных паседжанняў, мяркуючы па ўсім, без кансультацый з астатнімі членамі камісіі. Такі падыход да прыняцця рашэнняў азначаў, што толькі нешматлікія рашэнні прымаліся калегіяльна. За рэдкім выключэннем ТВК у перыяд назірання не збіраліся на паседжанні, аддаючы перавагу прыманню рашэнняў па розных пытаннях на неафіцыйных сустрэчах.

А.Казулін і А.Мілінкевіч неаднаразова выказвалі свой недавер палітычнай бесстароннасці выбарчых органаў. 17 сакавіка ў сумеснай заяве яны выказалі свой недавер да ЦВК у сувязі з «грубымі парушэннямі Канстытуцыі і шэрагу заканадаўчых актаў, якія маюць дачыненне да выбараў», запатрабаваўшы прызначыць новы склад ЦВК і адкласці выбары да ліпеня.

## VI. РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ

Паводле заканадаўства кандыдаты павінны былі вылучацца «ініцыятыўнымі групамі» выбаршчыкаў колькасцю не меней за 100 чалавек. Ініцыятыўныя групы павінны былі звярнуцца ў ЦВК за рэгістрацыяй не пазней, чым за 85 дзён да дня выбараў, на працягу сямі дзён пасля прызначэння даты выбараў. Для рэгістрацыі кандыдата яго ініцыятыўнай групе неабходна было сабраць і падаць подпісы не меней за 100000 грамадзян, якія маюць права голаса (далей – «подпісы за вылучэнне»). На збор подпісаў

[14] Кожны з кандыдатаў мог прызначыць да 30 упаўнаважаных прадстаўнікоў.

за вылучэнне ініцыятыўным групам быў прадастаўлены 30-дзённы тэрмін, які пачынаўся за 80 дзён да выбараў. Першапачаткова ЦВК зарэгістравала восем ініцыятыўных груп.

МНВ БДІПЧ/АБСЕ не змагла правесці назіранне за працэсам збору подпісаў з прычыны таго, што ён завяршыўся 26 студзеня 2006 года яшчэ да пачатку працы місіі. Тым не менш, назіральнікі атрымалі шматлікія паведамленні аб неаднолькавых адносінах да ўдзельнікаў кампаній апазіцыйных кандыдатаў у працэсе збору подпісаў з боку дзяржаўных органаў. Суразмоўцы заяўлялі аб тым, што ім адмаўлялася ў зборы подпісаў у студэнцкіх інтэрнатах і па месцы працы выбаршчыкаў, у той час як асобам, якія збіралі подпісы ў падтрымку А.Лукашэнкі і С.Гайдукевіча такая магчымасць, у асноўным, прадастаўлялася. Назіральнікам расказалі аб выпадках, калі людзей прымушалі ставіць подпіс за А.Лукашэнку, а на асоб, якія падтрымалі вылучэнне апазіцыйных кандыдатаў, аказваўся ціск, у тым ліку з пагрозамі звальнення з працы або адлічэння з ВНУ.

Дастатковую колькасць подпісаў за вылучэнне ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі (ТВК) [15] падалі чацвёра патэнцыйных кандыдатаў: Сяргей Гайдукевіч (Ліберальна-дэмакратычная партыя), Аляксандр Казулін (Сацыял-дэмакратычная партыя «Грамада»), дзеючы Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка (беспартыйны)[16] і Аляксандр Мілінкевіч (беспартыйны)[17]. На праверку сапраўднасці і колькасці подпісаў за вылучэнне ТВК было прадастаўлена 15 дзён.

У перыяд з 27 студзеня па 11 лютага патэнцыйныя кандыдаты павінны былі прадставіць у ЦВК дэкларацыі аб даходах і маёмасці. Дэкларацыі патрабаваліся не толькі ад самога кандыдата, але і блізкіх сваякоў, улічваючы яго жонку і бацькоў яго жонкі.

17 лютага ЦВК афіцыйна зарэгістравала чацвярых кандыдатаў. А.Казулін і А.Мілінкевіч пазіцыянавалі сябе ў якасці апазіцыі дзеючаму Прэзідэнту, тады як С.Гайдукевіч падносіў сябе ў якасці альтэрнатывы Прэзідэнту Лукашэнку. Рэгістрацыя гэтых чатырох кандыдатаў прадаставіла выбаршчыкам патэнцыйную магчымасць сапраўднага выбару. Тым не менш, нават пасля іх афіцыйнай рэгістрацыі права кандыдатаў балатавацца на выбарах гарантавана не было. Калі б ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці кандыдата была выяўлена недакладнасць або калі б кандыдат парушыў палажэнні аб парадку вядзення агітацыі, ЦВК мела права пазбавіць кандыдата рэгістрацыі. Тым не менш, такіх скасаванняў рэгістрацыі здзейснена не было.

## VII. РЭГІСТРАЦЫЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Цэнтралізаванай і агульнадаступнай крыніцы звестак аб колькасці выбаршчыкаў, папярэдне зарэгістраваных у розных тэрытарыяльных структурных адзінках сістэмы выбарчых камісій, не існавала. Спісы выбаршчыкаў былі складзены для кожнага выбарчага ўчастка ў асобнасці, а кансалідаваныя дадзеныя на любым узроўні вышэй

---

15 Ініцыятыўная група Валерыя Фралова падала недастатковую колькасць подпісаў, патэнцыйны кандыдат Аляксандр Вайтовіч адмовіўся ад удзелу ў выбарах 9 студзеня, а патэнцыйныя кандыдаты Сяргей Скрабец і Зянон Пазняк - 26 студзеня.

16 А.Лукашэнку афіцыйна падтрымалі каля 40 грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый.

17 А.Мілінкевіча афіцыйна падтрымала кааліцыя арганізацый «Дзесятка плюс».

асобных участкаў адсутнічалі. Крыжаванай праверкі спісаў дзеля выяўлення магчымых шматразовых запісаў, мяркуючы по ўсім, не праводзілася.

Першапачаткова, кожная УВК атрымала папярэдні спіс выбаршчыкаў ад мясцовых органаў кіравання, які належыла праверыць і ўдакладніць па меры неабходнасці. Законам не канкрэтызуецца, якім менавіта чынам гэта варта рабіць, аднак паводле Метадычных рэкамендацый ЦВК па працы УВК для ўдакладнення папярэдніх спісаў выбаршчыкаў было рэкамендавана праводзіць наведванне выбаршчыкаў па месцы жыхарства. Дадзеная працэдура была завершана да 4 сакавіка. Удакладненыя спісы былі прадстаўлены для азнаямлення выбаршчыкаў у памяшканнях УВК. Паводле аднаго з указанняў ЦВК выбаршчыкі могуць праверыць наяўнасць у спісе толькі запісу аб сабе. Кандыдаты права азнаёміцца з інфармацыяй аб рэгістрацыі выбаршчыкаў не мелі.

Выбарчым кодэксам не прадугледжана спыненне рэгістрацыі выбаршчыкаў напярэдадні выбараў. Больш таго, ён не абавязвае УВК паведамляць грамадскасці або вышэйстаячым камісіям дадзеныя аб колькасці грамадзян, зарэгістраваных у якасці выбаршчыкаў па выбарчым участку, а ЦВК - аб'яўляць напярэдадні выбараў колькасць выбаршчыкаў, занесеных у спіс увогуле па краіне. Тым не менш, 9 сакавіка сакратар ЦВК абвясціў, што для галасавання было зарэгістравана 7 020 000 грамадзян.

Выбаршчык, чыё імя не значылася ў спісе выбаршчыкаў, мог дадаткова ўносіцца ў яго да завяршэння галасавання ў дзень выбараў, прад'явіўшы адзін з прымальных дакументаў. Форма пратакола УВК аб выніках галасавання не прадугледжвае ўказання колькасці выбаршчыкаў, дадаткова занесеных у спісы на працягу ўсіх шасці дзён выбараў, у якасці асобных лічб. Выніковая колькасць зарэгістраваных выбаршчыкаў, якая склала 7133978 чалавек, была абвешчана толькі адначасова з вынікамі выбараў 23 сакавіка.

## VIII. УДЗЕЛ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЯЎ

Па выніках перапісу насельніцтва 1999 года насельніцтва Рэспублікі Беларусь налічвала 10045237 чалавек, у тым ліку: 8159073 беларуса, 1141731 рускі, 395712 паляка і 237014 украінца. Акрамя таго, у краіне прадстаўлены наступныя нацыянальнасці, колькасцю меней за 30000 чалавек кожная: яўрэі, армяне, татары, ромы і іншыя.

Па інфармацыі з замежных крыніц колькасць ромаў складае няшмат меней за 50000 чалавек. Па паведамленнях адвакатаў-рома беларускіх грамадзян з суполкі рома часта не ўключалі ў спісы выбаршчыкаў, аднак пасля адпаведнай просьбы часцей за ўсё іх імёны ў спісы ўносіліся дадаткова.

## IX. УДЗЕЛ ЖАНЧЫН

Сярод кандыдатаў, якія балатаваліся на выбарах, жанчын не было. Старшынёй ЦВК з'яўляецца жанчына, і жанчыны шырока прадстаўлены ў структурах выбарчых органаў. У ТВК жанчыны складалі 52% членаў, у той час як ва УВК жанчыны склалі каля 66 працэнтаў членаў і 40% старшыняў камісій.

# X. ПЕРАДВЫБАРНАЯ АГІТАЦЫЯ

## A. АГІТАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Выбары прадаставілі апазіцыі магчымасць напрамую выказаць свае погляды электарату праз дзяржаўныя СМІ і падчас публічных сустрэч, нават у становішчы жорсткай рэгламентацыі і пры вузкасці дапушчальных рамак. Нягледзячы на забароны, абмежаванні і перашкоды апазіцыйныя кандыдаты і палітычныя партыі ўсё ж зрабілі спробу правесці паўнавартасную агітацыйную кампанію. Нешматлікія незалежныя друкаваныя СМІ імкнуліся паведамляць выбаршчыкам аб альтэрнатыўных палітычных пазіцыях.

Перадвыбарная агітацыя афіцыйна стартавала 17 лютага з моманту рэгістрацыі чацвярых кандыдатаў. Перадвыбарная агітацыя да пачатку афіцыйнага перыяду агітацыі забаронена Выбарчым кодэксам. Да рэгістрацыі А.Мілінкевіча кандыдатам удзельнікі яго кампаніі неаднаразова спыняліся супрацоўнікамі міліцыі за тое, што мелі пры сабе агітацыйныя матэрыялы, а некалькі актывістаў былі затрыманы. Да шэрагу асобаў, якія пагрэбавалі забаронай на «датэрміновую агітацыю», былі ўжытыя адміністратыўныя санкцыі.

МНВ БДІПЧ/АБСЕ атрымала звесткі аб правядзенні толькі некалькіх агітацыйных мерапрыемстваў у падтрымку А.Лукашэнкі. У дадзеных выпадках сам кандыдат не ўдзельнічаў, а замест яго ў падтрымку яго перавыбрання выступалі давераныя асобы. Кандыдатура А.Лукашэнкі стала вельмі прыкметнай у якасці выконваючага свае абавязкі ў афіцыйна займаемай ім пасадзе, а таксама дзякуючы ўсебаковаму і спрыяльнаму асвятленню яго дзейнасці ў сродках масавай інфармацыі. Шматлікія назіральнікі паведамілі аб тым, што адчувалі цяжкасці ва ўсталяванні кантактаў з яго перадвыбарнымі штабамі на абласным і раённым узроўнях.

У той жа час вельмі прыкметнай была асобная кампанія «*за Беларусь*», якая прапагандавала дасягненні краіны[18]. У яе рамках па ўсёй Беларусі праходзілі канцэрты і мерапрыемствы, якія трансляваліся тэлеканалам «*АНТ*», а матэрыялы кампаніі размяшчаліся на вялікай колькасці рэкламных шчытоў[19]. З прычыны таго, што яна не была звязаная з афіцыйнай перадвыбарнай кампаніяй ніводнага з кандыдатаў, кампанія «*за Беларусь*» не падпадала пад палажэнні Выбарчага кодэкса. Разам з тым, у шэрагу выпадкаў падчас мерапрыемстваў у рамках кампаніі «*за Беларусь*» удзельнікі, у тым ліку дзяржаўныя службоўцы, напрамую заклікалі грамадзян прагаласаваць за А.Лукашэнку. Перадвыбарным штабам Мілінкевіча адносна дадзенай кампаніі была пададзена афіцыйная скарга. Скарга здаволена не была.

На працягу кампаніі С.Гайдукевіч паведамляў МНВ БДІПЧ/АБСЕ аб актыўным вядзенні агітацыі. Тым не менш, назіральнікам стала вядома аб правядзенні ўсяго некалькіх агітацыйных мерапрыемстваў у падтрымку С.Гайдукевіча.

---

18 Назва кампаніі «*за Беларусь*» адлюстравала лозунг аналагічнай кампаніі, якая прайшла ў 2004 годзе, ў падтрымку зняцця абмежавання прэзідэнцкага мандату двума тэрмінамі і дазвола Прэзідэнту Лукашэнка балатавацца на трэці тэрмін.

19 Канал «АНТ» адхіліў просьбу МНВ аб сустрэчы для абмеркавання мэты і фінансавання кампаніі «*за Беларусь*».

Дзяржаўныя органы не забяспечылі паўнавартасных умоваў вядзення перадвыбарнай агітацыі, у якіх кандыдаты або прадстаўнікі кампаніі і яе актывісты мелі б магчымасць па сваім жаданні сустракацца з выбаршчыкамі і свабодна абменьвацца поглядамі. Назіральнікі таксама паведамлялі, што прыхільнікі А.Лукашэнкі часта ўмешваліся ў правядзенне мітынгаў, арганізаваных апазіцыяй. Акрамя таго, кампаніі Мілінкевіча і Казуліна апынуліся ў невыгодным становішчы з прычыны таго, што СМІ так і не прадаставілі ім магчымасць расказаць аб сваіх поглядах і здольнасцях па-за фарматам бясплатнага эфірнага часу, прадастаўленага ўсім кандыдатам. Гэта перашкодзіла азнаямленню выбаршчыкаў з палітычнымі праграмамі апазіцыйных кандыдатаў.

## B. Павага да грамадзянскіх і палітычных правоў: Роля дзяржаўных органаў

Дзяржструктуры аказвалі падтрымку А.Лукашэнку, супраць апазіцыі ж, наадварот, адвольным чынам ўжывалася дзяржаўная ўлада. Агітацыйная дзейнасць апазіцыі была жорстка абмежавана, а боязь страціць працу або быць арыштаваным стрымлівала свабоду дзеянняў грамадзян. На працягу ўсёй кампаніі была відавочнай тэндэнцыя да запалохвання і далейшага прыгнечання незалежных друкаваных СМІ. Такія дзеянні перашкаджалі актыўнаму перадвыбарнаму дыялогу і паставілі пад сумненне гатовасць улад паважаць палітычную канкурэнцыю на аснове роўнасці перад законам і дзяржаўнай уладай.

Удзельнікі агітацыйнай работы ад апазіцыі падвяргаліся запалохванню і прыгнёту, а іх спробы сустракацца з выбаршчыкамі часцяком сутыкаліся з перашкодамі[20]. Назіральнікі паведамлялі аб тым, што шэраг мясцовых органаў улады ўсталяваў для сустрэч месцы, якія былі альбо занадта маленькімі па памеры, альбо размяшчаліся на ўскраінах гарадоў і пасёлкаў, або з'яўляліся цяжкадаступнымі па іншых прычынах[21]. Іншыя формы агітацыі, такія як распаўсюджванне ўлётак або расклейванне плакатаў, абмяжоўваліся і падвяргаліся рэгулярным праверкам[22], а ў шэрагу выпадкаў агітацыйныя матэрыялы канфіскоўваліся супрацоўнікамі міліцыі[23]. Некаторыя агітатары, якія распаўсюджвалі ўлёткі, былі аштрафаваныя рашэннямі судоў за раскідванне смецця[24]. Прадстаўнікі перадвыбарных штабоў паведамлялі, што з-за

[20] Да дня выбараў у МНВ назапасіўся спіс з каля 400 правераных інцыдэнтаў, звязаных з вядзеннем агітацыі, падчас якіх агітатары ад апазіцыі падвергнуліся прыгнёту, штрафам і арыштам.

[21] Напрыклад, у Оршы было ўсталявана ўсяго два такіх памяшкання. Адно з іх было занадта маленькага памеру для правядзення сустрэчы з грамадскасцю, тады як іншае (ёмістасцю каля 300 чалавек) было размешчана далёка ад цэнтра горада. У гэтым горадзе штаб кампаніі Мілінкевіча правёў сустрэчу на адчыненым паветры, якая была расцэненая як пазапраўная мясцовымі органамі міліцыі.

[22] У Гродне, пры насельніцтве горада каля 280 000 чалавек, мясцовыя ўлады вызначылі толькі 23 месцы для размяшчэння агітацыйных плакатаў. Назіральнікі паведамілі аб шэрагу выпадкаў, калі мясцовыя органы ўлады спрабавалі ўжыць палажэнні аб размяшчэнні агітацыйных матэрыялаў для абмежавання месцаў, у якіх грамадзянам можна раздаваць агітацыйныя ўлёткі.

[23] У Жлобіне агітацыйныя матэрыялы Мілінкевіча, якія змяшчалі фразу «новы Прэзідэнт», былі затрыманы супрацоўнікамі міліцыі, якія заявілі, што гэта процізаконна. На розных падставах была затрымана вялікая колькасць агітацыйнай літаратуры ў падтрымку А.Мілінкевіча, у тым ліку за «парушэнне санітарных нормаў» (Мінск, 11 сакавіка). Міністр унутраных спраў Навумаў паведаміў МНВ аб тым, што органы міліцыі канфіскоўвалі толькі тыя агітацыйныя матэрыялы, якія былі выраблены за кошт сродкаў звыш адведзенай на гэтыя мэты сумы.

[24] 6 сакавіка ў Гомелі адзін з удзельнікаў кампаніі Мілінкевіча быў пакараны за распаўсюджванне ўлётак, а яшчэ адзін быў выкліканы ў суд 9 сакавіка.

прыгнёту з боку дзяржаўных органаў прыцягненне валанцёраў і новых актывістаў з цягам кампаніі станавілася ўсё больш праблематычным.

Каля 80 працэнтаў працоўнага насельніцтва занята ў дзяржаўным сектары, у сваей большасці на аснове кароткатэрміновых кантрактаў. Гэта патэнцыйна магло стварыць атмасферу заклапочанасці, прадастаўляючы магчымасць аказання недапушчальнага ўплыву на насельніцтва, занятае ў дзяржсектары ў дачыненні да іх палітычных поглядаў і дзейнасці. Назіральнікі МНВ адзначалі грубыя злоўжыванні паўнамоцтвамі, у прыватнасці скліканне высокапастаўленымі службоўцамі выканаўчых камітэтаў сустрэч з працадаўцамі для іх інструктажу па прымусе сваіх падначаленых да галасавання за дзеючага Прэзідэнта[25]. Назіральнікі МНВ таксама атрымалі шмат паведамленняў аб агітацыі ў падтрымку дзеючага Прэзідэнта вышэйшым кіраўніцтвам заводаў і ВНУ[26]. Акрамя таго, асабліва на дзяржаўных службоўцаў і студэнтаў, аказваўся ціск у дачыненні да іх права ўдзельнічаць у палітычным працэсе, улічваючы выпадкі пагроз звальнення з працы або выключэння з ВНУ за падтрымку апазіцыі.

Часцяком мясцовыя органы ўлады і міліцыі выкарыстоўвалі палажэнні Закона «Аб масавых мерапрыемствах» для перашкаджэння правядзенню прымеркаваных да выбараў сходаў апазіцыі, у тым ліку сустрэч актывістаў кампаніі, якія праходзілі ў жылых памяшканнях. Гэта ўяўляла сабою ўшчамленне свабоды аб'яднанняў і публічных сходаў. Арганізатары несанкцыянаваных публічных мітынгаў часта падвяргаліся затрыманню і накладанню штрафаў. Недахопы Закона «Аб масавых мерапрыемствах» пагаршаліся тым падыходам, які ўжывалі мясцовыя суды, якія выкарыстоўвалі, асабліва на пазнейшай стадыі кампаніі, артыкул 31 Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях для заключэння арганізатараў і ўдзельнікаў несанкцыянаваных агітацыйных мерапрыемстваў пад адміністратыўны арышт[27].

Затрымоўваліся і арыштоўваліся многія выбітныя дзеячы апазіцыйных кампаній, што найсур'ёзным чынам падрывала агітацыйную дзейнасць у іх рамках. Да 18 сакавіка з 30 давераных асобаў А.Мілінкевіча 8 знаходзіліся пад вартай або адбывалі тэрмін адміністратыўнага зняволення, у тым ліку партыйныя лідэры В.Вячорка (Партыя «Беларускі народныя фронт») і А.Лябедзька («Аб'яднаная грамадзянская партыя»)[28]. Акрамя таго, яшчэ каля 100 актывістаў яго кампаніі былі затрыманыя або знаходзіліся пад адміністратыўным арыштам. Штаб кампаніі Казуліна паведаміў, што аналагічныя меры былі прынятыя ў дачыненні да 80 удзельнікаў яго кампаніі[29]. Скарг аб аналагічным звароце са сваімі актывістамі з боку ўлад ад штабоў кандыдатаў

25 Да прыкладу, так адбылося ў Маладзечне, дзе Намеснік старшыні раённага выканаўчага камітэта склікаў кіраўнікоў мясцовых прадпрыемстваў на сход, падчас якога ён заклікаў іх падтрымаць дзеючага Прэзідэнта і за гэта ж агітаваць сваіх падначаленых.

26 У адным дакументальна пацверджаным выпадку ў Віцебску кіраўнік групы кампаній у валоданні дзяржавы выдаў пісьмовае распараджэнне ўсім падначаленым прагаласаваць у перыяд датэрміновага галасавання (з 14 па 18 сакавіка) у працоўны час і аддаць свой голас за А.Лукашэнку.

27 Так адбывалася нягледзячы на тое, што адміністратыўнае зняволенне павінна выкарыстоўвацца толькі пры выключных акалічнасцях, і маглі быць ужытыя меней жорсткія санкцыі. Так артыкулам 167-1 Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях у якасці меры пакарання за ўдзел або арганізацыю масавых мерапрыемстваў у парушэнне ўсталяванага парадку прадугледжаны штраф.

28 В.Вячорка і яшчэ адна давераная асоба, У.Шанцаў, адбылі 15 сутак зняволення. А.Лябедзька двойчы затрымоўваўся.

29 Адна з давераных асобаў А.Казуліна, А.Ляўковіч, быў аштрафаваны на суму ў памеры 2200 даляраў ЗША ў эквіваленце за сустрэчу з удзельнікамі кампаніі ў прыватнай кватэры.

Лукашэнкі і Гайдукевіча ні на мясцовым, ні на цэнтральным узроўні да назіральнікаў не паступала.

Сярод іншых найболей істотных фактараў, якія супярэчаць параграфу 7.7 Капенгагенскага дакумента АБСЕ, якія паспрыялі стварэнню атмасферы запалохвання і заклапочанасці падчас кампаніі, былі адзначаныя наступныя:

- Заявы, зробленыя на прэс-канферэнцыі 16 сакавіка Старшынёй КДБ, Генеральным пракурорам і Міністрам унутраных спраў, адносна таго, што «пад выглядам выбараў» апазіцыя рыхтуе сілавы захоп улады ў дзень выбараў. Іх заява аб тым, што ўсе ўдзельнікі акцый пратэсту ў дзень выбараў будуць «лічыцца тэрарыстамі ў адпаведнасці з артыкулам 289 Крымінальнага кодэкса» пасеяла страх у грамадстве, а заўвага Старшыні КДБ аб тым, што кандыдат Мілінкевіч не будзе арыштаваны «да канчатка кампаніі», насіла відавочна пагрозлівы характар;
- 17 сакавіка ў сваім тэлезвароце да суайчыннікаў Прэзідэнт Лукашэнка перасцярог ад спроб сілавога захопу ўлады. Пазней ён гарантаваў, што не дапусціць «дзяржаўнага перавароту», і прыстрашыў тым, каго меў на ўвазе, у тым ліку прыхільнікам апазіцыі і актывістам грамадзянскай супольнасці, заявіўшы, што «мы згорнем ім шыю неадкладна, як качанятам»;
- У сярэдзіне сакавіка штаб кампаніі Лукашэнкі заявіў аб тым, што «грамадзяне павінны задумацца аб дабрабыце сваіх сем'яў» перш чым прыняць удзел у несанкцыянаваных агітацыйных мітынгах. Гэта магло выклікаць у звычайных грамадзян асцярогу адносна магчымых адказных мер прававога характару за выкарыстанне свайго права весці пошук і атрымоўваць інфармацыю і праводзіць мірныя сходы;
- 2 сакавіка пры спробе зарэгістравацца для ўдзелу ў арганізаваным урадавымі органамі 3-цім Усебеларускім народным сходзе з ужываннем грубай сілы быў затрыманы А.Казулін. Падчас інцыдэнтаў, звязаных з яго затрыманнем, былі здзейснены напады на некалькіх журналістаў і зроблены стрэлы па прыватным аўтамабілі ў непасрэднай блізкасці ад назіральнікаў ад АБСЕ. Пасля затрымання на некалькі гадзін А.Казуліну былі прад'ўленыя абвінавачванні ў двух правапарушэннях, якія падпадаюць пад Крымінальны кодэкс;
- Наведванне перадвыбарных штабоў супрацоўнікамі міліцыі і канфіскаванне агітацыйных матэрыялаў на падставе праверкі адпаведнасці іх вырабу беларускаму заканадаўству, у прыватнасці, выканання парадку фінансавання перадвыбарнай кампаніі[30]; і
- Сістэматычны прыгнёт удзельнікаў агітацыйнай працы органамі ўлады з выкарыстаннем палажэнняў аб «спыненні для вобыску», што спрыяла стварэнню атмасферы запалохвання[31].

---

30 Напрыклад, 21 лютага ў Магілёве кіраўнік мясцовага штаба А.Мілінкевіча быў затрыманы на шэсць гадзін, а вырабленыя ў адпаведнасці з законам 26170 агітацыйных улётак, якія знаходзіліся ў яго, былі забраныя. 24 лютага дадзеныя матэрыялы былі вернутыя. У Брэсце ў штаб-кватэры кампаніі Мілінкевіча, размешчанай у жылой хаце, быў праведзены вобыск на падставе пошуку пазапраўным чынам выробленай алкагольнай прадукцыі. Падчас вобыску былі забраныя агітацыйныя матэрыялы.

31 Штаб кампаніі Мілінкевіча ў Гомелі паведаміў назіральнікам, што ў перыяд паміж 23 лютага і 2 сакавіка было зафіксавана 23 выпадкі затрымання актывістаў кампаніі супрацоўнікамі міліцыі на 3 гадзіны і больш. У мясцовую пракуратуру была накіравана адпаведная скарга.

## XI. СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ І ВЫБАРЫ

### A. СВАБОДА СМІ

Паводле дадзеных Міністэрства інфармацыі ў Беларусі зарэгістравана 1222 друкаваных перыядычных выдання, восем інфармацыйных агенцтваў, 54 праграмы тэлевяшчання і 154 праграмы радыёвяшчання[32]. Асноўнай доляй уласнасці ва ўсіх агульнанацыянальных электронных СМІ, якія вяшчаюць з Беларусі, валодаюць дзяржструктуры. Як паведамілі прадстаўнікі беларускіх СМІ, мясцовыя электронныя СМІ не прапануюць шырокага асвятлення палітычных падзей у Беларусі. Круг даступных беларускай грамадскасці СМІ пашыраюць тэле- і радыёперадачы каналаў, трансляваных з суседніх краін. Тым не менш, дадзеныя трансляцыі альбо маюць абмежаванае тэрытарыяльнае пакрыццё, альбо, як у выпадку з расійскімі каналамі, змяшчаюць невялікі аб’ём інфармацыі аб палітычных падзеях у Беларусі.

Электронныя СМІ, нават нягледзячы на тое, што часам фармальна і не ўваходзяць у дзяржаўную медыйную сетку, усебакова і ў спрыяльным ключы асвятляюць дзейнасць Прэзідэнта і ўрада. Нягледзячы на тое, што на мясцовым узроўні працуе некалькі прыватных электронных СМІ, незалежных беларускіх электронных СМІ агульнанацыянальнага вяшчання не існуе. Асноўнай крыніцай альтэрнатыўнай інфармацыі з'яўляюцца недзяржаўныя друкаваныя СМІ і Інтэрнэт. Па звестках, атрыманых у Беларускай асацыяцыі журналістаў, са звыш 1000 зарэгістраваных друкаваных выданняў каля 30 маюць незалежную рэдактарскую калонку, прысвечаную грамадска-палітычным падзеям. Пры гэтым за апошнія некалькі год шмат недзяржаўных агульнанацыянальных і рэгіянальных друкаваных СМІ былі зачынены. У цяперашні час не выдаецца ніводнай незалежнай штодзённай газеты. Шмат з застаўшыхся незалежных друкаваных СМІ больш не маюць магчымасці распаўсюджваць свой тыраж праз дзяржаўную рознічную сетку. Дадзеныя цяжкасці, створаныя для незалежных СМІ, супярэчаць параграфу 7.8 Капенгагенскага дакумента 1990 года.

З прычыны складанасцяў са знаходжаннем друкарні ў Беларусі незалежныя выданні «*Народная воля*» і «*Товарищ*» друкаваліся ў Смаленску (Расійская Федэрацыя). Абедзве газеты лічацца сімпатызуючымі апазіцыі. 3 сакавіка супрацоўнікі міліцыі затрымалі ўвесь тыраж «*Народнай Волі*» (250 000 экзэмпляраў). Органы міліцыі неаднаразова канфіскоўвалі экзэмпляры «*Народнай волі*» і «*Товарища*» у распаўсюджвальнікаў. 13 сакавіка смаленская друкарня скасавала свой кантракт з дадзенымі выданнямі, а таксама з газетай «*БДГ Деловая Газета*» па «прычынах палітычнага і эканамічнага характару».

Дадзеныя СМІ спрабавалі працягнуць сваю дзейнасць шляхам друкавання экзэмпляраў у іншых друкарнях за межамі Беларусі. 14 сакавіка ізноў быў затрыманы ўвесь тыраж «*Народнай Волі*», а 17 сакавіка было затрымана 190 000 экзэмпляраў «*Товарища*». Органы міліцыі так і прадставілі ў абгрунтаванне сваіх дзеянняў якіх-небудзь афіцыйных дакументаў. Пасля канфіскацый 14 і 17 сакавіка да 19 сакавіка, дня выбараў, новых нумароў дадзеных газет больш не выдавалася.

---

32 Па стане на 1 лютага 2006 года.

Прадстаўнікі СМІ паведамілі МНВ БДІПЧ/АБСЕ, што журналісты часта практыкуюць самацэнзуру[33]. Абмежавальная прававая база, у рамках якой абраза Прэзідэнта і некаторых прадстаўнікоў улады караецца працяглымі тэрмінамі пазбаўлення свабоды, а на электронныя СМІ аказваецца значны палітычны ўплыў, стрымлівае свабодны абмен палітычнымі поглядамі. На працягу выбарчай кампаніі цэлы шэраг журналістаў былі ўзятыя пад варту органамі міліцыі або затрыманы з выкарыстаннем грубай сілы пры выкананні сваіх прафесійных абавязкаў[34]. Значная колькасць журналістаў была таксама арыштавана пры асвятленні падзей пасля выбараў (гл. ніжэй, «Падзеі пасля выбараў»).

## B. Прававыя рамкі

Выбарчы кодэкс прадастаўляе кандыдатам роўныя правы на выступленне са зваротамі на дзяржаўным тэлебачанні і радыё і выкарыстанне бясплатнай друкаванай плошчы ў дзяржаўных друкаваных СМІ. Эфірны час і друкаваная плошча ў газетах прадастаўляюцца бясплатна. Тым не менш, дзяржаўныя СМІ не абавязаны забяспечваць збалансаванасць асвятлення дзейнасці кандыдатаў і іх роўны доступ да эфірнага часу ў навінах і праграмах палітычнага зместу. Правядзенне трансляваных па тэлебачанні дэбатаў паміж кандыдатамі Выбарчым кодэксам не прадугледжана.

Роля, правы і абавязкі прыватных СМІ падчас выбараў Выбарчым кодэксам не рэгламентуюцца; ім таксама не вызначана, ці дазваляецца размяшчэнне агітацыйнай рэкламы на платнай аснове, а таксама бясплатная рэклама ў СМІ. Старшыня ЦВК публічна папярэдзіла неўпаўнаважаныя СМІ аб тым, што прадастаўленне кандыдатам друкаванай плошчы для публікацыі агітацыйных матэрыялаў будзе лічыцца парушэннем артыкула 48 Выбарчага кодэкса. Тым не менш, зробленая пасля сакратаром ЦВК заява аб дапушчальнасці публікацыі праграмы А.Лукашэнкі ў адной з неўсталяваных газет на падставе «меркавання рэдактара» бачыцца супярэчнасцю раней прапанаванаму тлумачэнню заканадаўства старшынёй ЦВК. Адсутнасць яснасці адносна юрыдычных правоў СМІ пры асвятленні кампаній кандыдатаў стварыла сярод СМІ некаторую блытаніну.

8 лютага ЦВК прыняла пастанову адносна парадку вядзення кандыдатамі агітацыі ў СМІ. Кожнаму кандыдату было прадастаўлена права апублікаваць агітацыйныя матэрыялы ў аб'ёме пяці машынапісных старонак у сямі дзяржаўных газетах[35] і выступіць з дзвюма ідучымі ў запісы праграмнымі заявамі па тэлебачанні і двума на радыё працягласцю не больш за 30 хвілін. 17 лютага для вызначэння чарговасці трансляцыі тэле- і радыёзваротаў кандыдатаў была праведзена жараб'ёўка. Агітацыйныя выступленні трансляваліся ў перыяд з 21 лютага па 6 сакавіка[36] з 6 да 7 гадзін вечара, - час, калі не збіраецца максімальная гледачовая аўдыторыя. Пасля 6

---

33 Напрыклад, у перыяд агітацыйнай кампаніі адзін навінавы бюлетэнь у Бабруйску меў намер ўзяць інтэрв'ю ў прадстаўнікоў кандыдатаў, але вырашыў адмовіцца ад гэтага пасля папярэджанняў з боку ўлад.

34 2 сакавіка пры спробе А.Казуліна патрапіць на Усебеларускі народны сход на некалькі гадзін быў затрыманы шэраг журналістаў, а па меншай меры двое журналістаў былі збітыя невядомымі людзьмі ў цывільным. Адзін з іх быў пасля шпіталяваны з дыягназам «пералом касцей носу». 12 сакавіка пры прамой трансляцыі адной з сустрэч А.Мілінкевіча на некалькі гадзін быў затрыманы ўкраінскі журналіст аднаго з украінскіх тэлеканалаў.

35 «Беларуская ніва», «Народная газета», «Рэспубліка», «Советская Белоруссия», «Знамя юности», «Звязда» і «7 дней».

36 На дзяржаўным канале «БТ1» выступленні трансляваліся 21 і 22 лютага і 1 і 2 сакавіка. На дзяржаўнай радыёстанцыі «БР1» яны трансляваліся 24 і 27 лютага і 3 і 6 сакавіка.

сакавіка, на працягу амаль двух тыдняў да дня выбараў, 19 сакавіка, ніякіх афіцыйных выступаў не транслявалася.

12 снежня 2005 года ЦВК заснавала Наглядальны савет па кантролю за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі. У яго склад увайшло сем членаў, якія прадстаўлялі ўрадавыя структуры і дзяржаўныя СМІ. МНВ БДІПЧ/АБСЕ сустрэлася з яго Старшынёй, Намеснікам Міністра інфармацыі, які заявіў, што юрысдыкцыяй па вынясенні рашэнняў па скаргах і спрэчках у дачыненні да асвятлення кампаній кандыдатаў у СМІ валодае ЦВК, а не Наглядальны савет, роля апошняга ж з'яўлялася выключна кансультатыўнай. У перыяд кампаніі Наглядальны савет толькі зрэдку праводзіў паседжанні, а яго рашэнні, мяркуючы па ўсім, не гулялі значнай ролі ў вырашэнні спрэчных сітуацый з удзелам СМІ.

## C. Маніторынг СМІ

Пачынаючы з 12 лютага МНВ БДІПЧ/АБСЕ правяла якасны і колькасны аналіз зместу выходзячых у прайм-тайм перадач на чатырох тэлеканалах, ранішніх праграм навін на дзяржаўнай радыёстанцыі і дзевяці газет[37].

Агульнанацыянальныя СМІ асвятлялі працэдурныя аспекты правядзення выбараў. У афіцыйны перыяд вядзення агітацыі канал «БТ1» прысвяціў каля 9 працэнтаў часу ў навінах пытанням выбараў. У навінавых зводках тэлеканалаў «БТ1», «АНТ» і «СТБ» на заявы прадстаўнікоў ЦВК прыйшлося прыблізна 5 працэнтаў часу, прысвечанага асвятленню палітычных дзеячаў і дзеючых асобаў выбараў.

А.Лукашэнка не скарыстаўся прадастаўленым яму бясплатным эфірным часам для агітацыі, тады як астатнія тры кандыдаты запісалі свае выступленні для трансляцыі. 2 сакавіка Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія выразала частку тэлезвароту А.Казуліна, палічыўшы, што ён дапусціў «непацверджаныя абвінавачванні» у адрас А.Лукашэнкі і двух яго сыноў[38]. 6 сакавіка Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія падвергнула цэнзуры радыёзвароты А.Казуліна і А.Мілінкевіча без апавяшчэння аб гэтым кандыдатаў. З выступлення А.Казуліна было выразана каля сямі хвілін крытычных каментарыяў у адрас Прэзідэнта, а са звароту А.Мілінкевіча - прыкладна адна хвіліна, калі ён распавядаў аб фактычных памылках, дапушчаных

---

37 Маніторынг ахопліваў наступныя СМІ: дзяржаўны тэлеканал «БТ1» (Першы нацыянальны тэлеканал), тэлеканалы ў валоданні акцыянерных кампаній з кантрольнай доляй дзяржавы «АНТ» (Агульнанацыянальнае тэлебачанне) і «СТБ» (Сталічнае тэлебачанне), расійскі тэлеканал «РТР» (тэлеканал Расія) і дзяржаўная радыёстанцыя «БР1» (Першы нацыянальны канал беларускага радыё), чатыры фінансуемых з дзяржбюджэту газеты («*Народная газета*», «*Рэспубліка*», «*Советская Белоруссия*» *і* «*Звязда*») і пяць недзяржаўных газет («*БелГазета*», «*Белорусы и рынок*», «*Комсомольская правда в Белоруссии*», «*Народная воля*» і «*Обозреватель*»).

38 Пастанова ЦВК аб парадку выкарыстання СМІ ў перадвыбарнай агітацыі надзяліла кіраўніка СМІ паўнамоцтвамі адмовіць кандыдату ў прадастаўленні эфірнага часу або апублікаванні праграмы ў тым выпадку, калі выступленне не адпавядае патрабаванням палажэнняў Выбарчага кодэкса. У адпаведнасці з Кодэксам, агітацыйныя матэрыялы не павінны змяшчаць прапаганды вайны, заклікаў да гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу, парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, абраз і паклёпу ў дачыненні да службовых асобаў Рэспублікі Беларусь, кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты. Забараняюцца агітацыя або прапаганда сацыяльнага, расавага, нацыянальнага, рэлігійнага або моўнага пераўзыходства, выпуск і распаўсюджванне паведамленняў і матэрыялаў, узбуджаючых сацыяльную, расавую, нацыянальную або рэлігійную варожасць.

Прэзідэнтам у адным з яго выступленняў. Нягледзячы на пададзеныя ў ЦВК афіцыйныя скаргі, дзяржаўны вяшчальнік не быў абавязаны тлумачыць падставы, на якіх выступленні былі падвергнуты цэнзуры.

Бясплатная плошча ў дзяржаўных газетах не прадастаўлялася на роўных умовах усім кандыдатам. Калі перадвыбарная праграма А.Лукашэнкі была апублікавана на першых старонках, то праграмы іншых кандыдатаў былі надрукаваны не так навочна з вылучэннем ім меншай плошчы. Праграма А.Мілінкевіча не была надрукавана з прычыны таго, што яна не была пададзена ім ва ўсталяваны Цэнтрвыбаркамам у адміністратыўным парадку тэрмін[39].

Кандыдатура А.Лукашэнкі атрымала значную падтрымку ў навінавых праграмах на трох асноўных тэлеканалах і дзяржаўнай радыёстанцыі. На працягу афіцыйнага перыяду перадвыбарнай агітацыі ў праграмах навін, якія выходзілі ў прайм-тайм, усім чацвярым кандыдатам (разам узятым) была прысвечана наступная колькасць часу: «БТ1» (5 гадзін 22 хвіліны), «АНТ» (5 гадзін 7 хвілін), «СТБ» (4 гадзіны 3 хвіліны) і «БР1» (46 хвілін). З гэтага часу, на А.Лукашэнку прыйшлося 99 працэнтаў на «АНТ», 93 працэнта на «БТ1», 96 працэнтаў на «СТБ» і 99 працэнтаў на «БР1»[40] . У іншых праграмах палітычнага зместу на агульнанацыянальных тэлеканалах А.Лукашэнка фігураваў нашмат часцей за сваіх супернікаў[41]. Увогуле, яго характарызавалі са станоўчага боку.

У супрацьлегласць гэтаму, за выключэннем цырымоніі рэгістрацыі кандыдатаў 17 лютага і бясплатнага эфірнага часу на працягу ўсёй кампаніі ніводнае з асноўных электронных СМІ не прадаставіла тром астатнім кандыдатам якой-небудзь магчымасці выказаць свае погляды і не падавала іх кампаніі ў якасці аб'ектаў палітычнай важнасці. Калі кандыдаты ад апазіцыі і згадваліся, то, галоўным чынам, у негатыўным кантэксце. Пры гэтым СМІ выдалі ў эфір шэраг аналітычных праграм і дакументальных фільмаў, у якіх «апазіцыя», улічваючы апазіцыйныя палітычныя партыі і асобныя НУА, характарызавалася ў вельмі негатыўным святле[42] .

У шэрагу выпадкаў А.Лукашэнка карыстаўся сваёй афіцыйнай пасадай для адстойвання вынікаў сваёй палітычнай дзейнасці, а часам і для крытыкі апазіцыі. 2 і 3 сакавіка СМІ ў прамым эфіры транслявалі яго працяглае выступленне на арганізаваным урадавымі органамі 3-цім Усебеларускім народным сходзе, які стаў самай прыкметнай палітычнай падзеяй у перыяд кампаніі. СМІ таксама паказалі шматлікія выступленні ў падтрымку Прэзідэнта іншых прамоўцаў на Сходзе. Акрамя таго, у рамках некаторых мерапрыемстваў праходзіўшай адначасова кампаніі «за Беларусь», якая транслявалася

---

39 Тым не менш, адказваючы на аналагічны зварот падчас парламенцкіх выбараў 2004 года, ЦВК заявіла, што дадзены тэрмін служыць толькі ў якасці арыентыру, і яго незахаванне не прыводзіць да страты права публікацыі праграмы кандыдатам.

40 У навінавых праграмах расійскага тэлеканала «РТР» усім чацвярым кандыдатам было прысвечана 20 хвілін, з якіх на Прэзідэнта Лукашэнку прыйшлося 80 працэнтаў.

41 Напрыклад, з агульнага часу, адведзенага ўсім чацвярым кандыдатам у аналітычных праграмах, А.Лукашэнку было прысвечана 83 працэнта часу на «БТ1», 91% часу на «АНТ» і 99% часу на «СТБ».

42 Улічваючы праграмы, у якіх рабіліся заявы аб тым, што апазіцыйныя кандыдаты з'яўляюцца сродкам замежных інтарэсаў, якія рыхтуюць «рэвалюцыю» у Беларусі. У СМІ часта выходзілі ў эфір дакументальныя фільмы, у якіх распавядалася аб развіцці палітычных падзей у іншых былых рэспубліках СССР і рабіліся сцвярджэнні аб удзеле замежных дзяржаў у «рэвалюцыях», у прыватнасці ў Грузіі, Украіне і Кыргызстане.

на канале «АНТ», рабіліся заявы, у тым ліку дзяржаўнымі службоўцамі, с заклікамі да людзей галасаваць за А.Лукашэнку.

9 сакавіка ў эфір «АНТ» выйшла ток-шоў «*Выбар*» з «тэлефонным галасаваннем», падчас якога гледачы маглі патэлефанаваць, каб «прагаласаваць» за кандыдата, якому яны аддаюць перавагу. Пры гэтым з прычыны таго, што праграма не ішла ў прамой трансляцыі, а была запісана за некалькі дзён да выхаду ў эфір, гледачы фактычна не мелі магчымасці ўдзельнічаць у апытанні. Гледачам канал аб гэтым не паведаміў. Незадоўга да заканчэння праграмы вядучы абвясціў, што па выніках апытання А.Лукашэнка атрымаў 78 працэнтаў галасоў гледачоў.

З сукупнай плошчы, адведзенай чацвярым кандыдатам, фінансуемыя з дзяржаўнага бюджэту газеты («*Народная газета*», «*Рэспубліка*», «*Советская Белоруссия*» і «*Звязда*») прысвяцілі А.Лукашэнку больш за 90 працэнтаў. Асвятленне вялося альбо ў «нейтральным» тоне, альбо са «станоўчым» падтэкстам. У той жа час недзяржаўная газета «*Белорусы и рынок*» прысвяціла А.Мілінкевічу найбольшы аб'ём асвятлення (46 працэнтаў), за ім ішлі А.Лукашэнка (33 працэнта), А.Казулін (14 працэнтаў) і С.Гайдукевіч (7 працэнтаў). Дзве недзяржаўныя газеты, «*БелГазета*» і «*Комсомольская правда в Белоруссии*», падавалі інфармацыю аб больш шырокім крузе кандыдатаў. У дадзеных выданнях ніводны з кандыдатаў не атрымаў больш за 33 працэнты аб'ёму асвятлення. Асвятленне чацвярых кандыдатаў у газеце «*Обозреватель*» было невялікім. МНВ БДІПЧ/АБСЕ не змагла завяршыць кантэнтны аналіз з прычыны канфіскацыі экзэмпляраў «*Народнай волі*».

У перадвыбарны перыяд у СМІ з'яўлялася шмат негатыўных артыкулаў аб «міжнародных назіральніках», у якіх беларускія службоўцы, а часам і грамадзяне Расійскай Федэрацыі вінавацілі МНВ БДІПЧ/АБСЕ ў загадзя нарыхтаваных высновах аб выбарах, у палітычнай прадузятасці і ўжыванні падвойных стандартаў пры ацэнцы выбараў. Міжнародных назіральнікаў за выбарамі нават абвінавацілі ў «выкананні заказа». У шэрагу выпадкаў падкантрольныя дзяржаве СМІ падавалі інфармацыю аб МНВ БДІПЧ/АБСЕ ў цалкам скажонай форме[43]. Дзяржаўныя СМІ надалі мала ўвагі Папярэднім заключэнням і высновам ММНВ. У тых выпадках, калі дадзены дакумент згадваўся, яго змест падаваўся выбарна, а сэнс часцяком скажаўся.

## XII. ЗАЯВЫ І СКАРГІ, ЗВЯЗАНЫЯ З ВЫБАРАМІ

Дзеючым заканадаўствам прадугледжана, што калі ў выбарчыя органы грамадзяне, у абмежаванай ступені, скаргі падаваць могуць, то на разгляд у суд можна падаць не ўсе віды скаргаў. Выбарчым кодэксам прама не прадугледжана магчымасць абскардзіць бяздзейнасць выбарчых камісій. Хоць Кодэксам прадугледжана, што рашэнні ЦВК па некаторых пэўных пытаннях могуць быць абскарджаны ў Вярхоўным судзе[44], у

---

43 У прыватнасці ў артыкуле з назвай «Отрабатывая политические решения … или Нужны ли нам такие наблюдатели», апублікаванай 22 сакавіка ў газеце «*Рэспубліка*».

44 Адмова ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы (артыкул 61); адмова ў рэгістрацыі асобе, вылучанай кандыдатам у Прэзідэнты (артыкул 68); і прызнанне выбараў несапраўднымі (артыкул 79). Суды таксама могуць разглядаць скаргі на: недакладнасці ў спісе выбаршчыкаў, маючых права голаса, дапушчаныя камісіямі (артыкул 21); рашэнні органа, што прызначае склад камісіі, аб спыненні паўнамоцтваў аднаго з членаў выбарчай камісіі (артыкул 36); рашэнне выбарчай камісіі аб прызнанні зняцця кандыдатам у Прэзідэнты сваёй кандыдатуры без паважлівых прычынаў (артыкул 69).

дачыненні да іншых пытанняў практычны механізм юрыдычнага аспрэчвання рашэнняў ЦВК адсутнічае.

Недахопы прававой базы пагаршаліся падыходам ЦВК да вырашэння спрэчак, звязаных з выбарамі. Да 17 сакавіка ў ЦВК паступіла маючых дачыненне да выбараў пісьмовых заяваў, зваротаў і скарг у колькасці 231 дакумента. Рашэнне аб неабходнасці правядзення паседжання ЦВК для разгляду і вынясення калегіяльнага рашэння ў дачыненні да пісьмовай заявы прымае Старшыня ЦВК. Тым не менш, нягледзячы на тое, што на большасць з атрыманых пісьмовых заяваў службовыя асобы ЦВК накіравалі адказы, з 18 студзеня да дня выбараў Цэнтрвыбаркам не правёў ніводнага афіцыйнага паседжання для разгляду скарг, звязаных з выбарамі.

Роля судовых органаў, у тым ліку Вярхоўнага суду, у прадастаўленні прававой абароны на працягу ўсяго выбарчага працэсу заставалася мінімальнай. Падчас кампаніі судовыя органы на месцах у парадку паскоранага судаводства вынеслі абвінаваўчыя заключэнні ў дачыненні да значнай колькасці актывістаў кампаніі ад апазіцыі за правядзенне несанкцыянаваных сустрэч з выбаршчыкамі і парушэнні парадку вядзення агітацыі. Прадстаўнікі апазіцыі часта выказвалі МНВ БДІПЧ/АБСЕ свой недавер да незалежнасці і бесстароннасці выбарчых і судовых органаў.

Некаторыя скаргі ў сувязі з выбарамі падаваліся ў органы пракуратуры на месцах. Нягледзячы на атрыманыя ў Генеральнай пракуратуры запэўненні ў зваротным, МНВ БДІПЧ/АБСЕ не было прадастаўлена падрабязнай інфармацыі аб усіх такіх скаргах і выніках іх разгляду. У шэрагу выпадкаў назіральнікі МНВ, якія працавалі ў рэгіёнах, адчувалі цяжкасці з атрыманнем інфармацыі адносна колькасці заяваў, пададзеных у мясцовыя органы пракуратуры.[45].

## XIII. МЯСЦОВЫЯ НАЗІРАЛЬНІКІ ЗА ВЫБАРАМІ

ЦВК паведаміла, што ў ТВК і УВК было зарэгістравана каля 32000 мясцовых назіральнікаў. Большасць з іх была вылучана ад працоўных калектываў і іншых «грамадскіх аб'яднанняў», большасць якіх сімпатызуе ўладзе дзеючага Прэзідэнта. У шэрагу выпадкаў у якасці мясцовых назіральнікаў выступалі супрацоўнікі выканаўчых камітэтаў мясцовых органаў улады.

Дзейнасць мясцовых незалежных груп назіральнікаў была значна меней актыўнай у параўнанні з мінулымі выбарамі. На папярэдніх выбарах не прайшоўшая рэгістрацыю грамадзянская ініцыятыва «Партнёрства» каардынавала ў дзень выбараў дзейнасць па назіранню каля 3000 назіральнікаў. Аднак 21 лютага праваахоўныя органы правялі вобыскі офісных памяшканняў і кватэр шэрагу грамадзянскіх актывістаў[46], у тым ліку членаў «Партнёрства», а чатыры лідэры былі арыштаваныя КДБ. Арышт кіраўніцтва перашкодзіў арганізацыі аналагічнага шырокамаштабнага назірання на прэзідэнцкіх выбарах 2006 года. 23 лютага КДБ выступіў з заявай аб тым, што арыштаваныя асобы абвінавачваюцца ў «кіраўніцтве незарэгістраванай арганізацыяй, дзейнасць якой спалучана з замахамі на правы і законныя інтарэсы грамадзян» Пасля іх арышту, КДБ

---

45 Напрыклад, у Слоніме мясцовы пракурор адмаўляў атрыманне якіх-небудзь заяў, звязаных з выбарамі. Ісцец раней падаў назіральнікам копіі сваіх звязаных з выбарамі скарг. Пасля прад'яўлення копій заяў пракурор змяніў свой адказ.

46 Вобыскі прайшлі ў розных гарадах па ўсёй Беларусі, у тым ліку ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Магілёве, Полацку, Наваполацку і Быхаве.

публічна абвінавацiў дадзеную групу ў падрыхтоўцы сілавога захопу ўлады. На момант завяршэння дадзенай справаздачы яны ўсё яшчэ знаходзіліся ў следчым ізалятары КДБ.

Некаторыя НУА, у тым ліку Беларускі Хельсінкскі камітэт, усё ж выставілі сваіх назіральнікаў у дзень выбараў, хоць і значна меншай колькасцю, чым першапачаткова планавалася. Праваабарончы цэнтр «*Вясна*», у дачыненні да якога ў 2003 годзе было прынята рашэнне аб адмене рэгістрацыі, у адрозненні ад папярэдніх выбараў назіранне за выбарамі не праводзіў, нягледзячы на тое, што некаторыя з яго былых членаў вялі назіранне як радавыя грамадзяне пры падтрымцы грамадзянскіх ініцыятыў[47].

Самі кандыдаты выстаўлялі назіральнікаў у асноўным праз вылучэнне ад палітычных партый і грамадзянскіх ініцыятыў, якія іх падтрымалі. Кампаніі Гайдукевіча і Лукашэнкі паведамілі аб выстаўленні звыш 20000 назіральнікаў ад кожнай. Двое іншых кандыдатаў сканцэнтравалі намаганні на невялікай колькасці ўчасткаў для галасавання з відавочным намерам атрымаць дакладныя дадзеныя вынікаў.

## XIV. ГАЛАСАВАННЕ І ПАДЛІК ГАЛАСОЎ

### A. ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ, 14-18 САКАВІКА

Назіральнікі атрымоўвалі паведамленні аб тым, што кіраўніцтва некаторых кампаній і дырэктары навучальных устаноў далі сваім супрацоўнікам указанне прагаласаваць датэрмінова[48]. З дадзеных паведамленняў вынікала, што ў шэрагу выпадкаў персаналу пагражалі скасаваннем працоўных кантрактаў, а студэнтам - пакараннямі. Дэ-факта такія дзеянні замахнуліся на «роўнасць» выбарчага права, прадугледжанага параграфам 7.3 Капенгагенскага дакумента АБСЕ. Лічба яўкі па перыядзе датэрміновага галасавання была зафіксавана на ўзроўні 31 працэнта, што нашмат перавысіла аналагічны паказчык на выбарах 2004 года, які склаў 17 працэнтаў.

Доўгатэрміновыя назіральнікі ладзілі маніторынг датэрміновага галасавання з 14 па 18 сакавіка, а кароткатэрміновыя - 18 сакавіка. У агульнай колькасці імі было адпраўлена 2022 справаздачы аб назіранні, у 11% з якіх працэдура датэрміновага галасавання атрымала негатыўную ацэнку. Шмат УВК не жадалі паведамляць назіральнікам базавыя лічбы, напрыклад, колькасць атрыманых бюлетэняў[49], колькасць выбаршчыкаў, занесеных у спісы, і колькасць прагаласаваўшых выбаршчыкаў. Некаторыя УВК адказалі назіральнікам, што ТВК або мясцовыя органы выканаўчай улады далі ім указанне не прадастаўляць назіральнікам такой інфармацыі.

Назіральнікі адзначылі, што ўвогуле датэрміновае галасаванне праходзіла ў спакойнай атмасферы. Нягледзячы на тое, што сама працэдура праходзіла ва ўсталяваным парадку, назіральнікі часта фіксавалі патэнцыйна сур'ёзныя адхіленні, у тым ліку відавочна ідэнтычныя роспісы ў спісах выбаршчыкаў. Сярод іншых недахопаў

---

47 Выбаршчыкі таксама могуць звяртацца з просьбай аб рэгістрацыі ў якасці назіральнікаў пры падачы дзесяці подпісаў выбаршчыкаў з адпаведнай выбарчай тэрытарыяльнай структуры.

48 Напрыклад: у Барысаве, Гродне, Слуцку, Салігорску. У Брэсце заклікі да выбаршчыкаў прагаласаваць датэрмінова гучалі ў мясцовых тралейбусах. Адзін з кіроўцаў паведаміў, што калі б ён не рабіў такіх аб'яў, яму бы панізілі зарплату.

49 У выпадках, калі гэтыя дадзеныя паведамляліся, шэраг назіральнікаў адзначылі непаслядоўнасць пры іх размеркаванні; некаторыя ўчастковыя камісіі паведамлялі аб выдачы ім бюлетэняў у колькасці роўнай лічбе занесеных у спісы выбаршчыкаў, тады як іншыя атрымоўвалі і дадатковых 10 працэнтаў.

адзначаліся наступныя: нізкая якасць пячатак на скрынях для галасавання, незапячатванне адтулін у скрынях па заканчэнні датэрміновага галасавання 18 сакавіка, што ўяўляе сабою парушэнне закона[50], і прысутнасць неўпаўнаважаных асоб на 5% наведаных выбарчых участкаў, шмат з якіх давалі ўказанні па працы УВК. Падчас апытання 19 сакавіка шмат УВК валодала інфармацыяй аб працэнтнай долі выбаршчыкаў, якія прагаласавалі датэрмінова, але паказчык яўкі ў лічбавым выразе не ведалі.

## B. ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ, 19 САКАВІКА

Увогуле галасаванне прайшло ў спакойнай і мірнай атмасферы і было добра арганізавана. У значнай большасці выпадкаў у складзе УВК прысутнічала патрабаваная па законе колькасць членаў, і яны валодалі матэрыяламі па выбарах у дастатковым аб'ёме. Назіральнікі паведамілі, што за рэдкім выключэннем УВК прытрымліваліся правільных працэдур выдачы бюлетэняў. Доступ выбаршчыкаў на ўчасткі для галасавання быў свабодным, адмоўлена ў галасаванні на выбарчых участках было вельмі невялікай колькасці патэнцыйных выбаршчыкаў. Часцей за ўсё выбаршчыкі і УВК дэманстравалі добрае валоданне выбарчымі працэдурамі. У той жа час назіральнікі адзначалі дрэнную якасць пячатак і неналежнае апячатванне многіх скрынь для галасавання.

Разам з тым назіральнікі адзначылі, што УВК часта адмаўляліся паведаміць базавую інфармацыю па асноўных лічбах галасавання[51]. З 10% справаздач вынікала, што назіральнікі сутыкаліся з перашкодамі ў ажыццяўленні імі сваёй дзейнасці, а зрэдку некаторыя з іх падвяргаліся запалохванню. Часцяком назіральнікам не дазвалялі азнаёміцца са спісамі выбаршчыкаў. Гэта азначала, што шмат з іх не маглі ацаніць яўку, убачыць, колькі выбаршчыкаў прагаласавала датэрмінова, і пераканацца ў тым, што выбаршчыкі распісваліся ў спісе выбаршчыкаў пры атрыманні бюлетэняў. У адрозненні ад выбараў 2004 года большасці назіральнікаў быў прадастаўлены доступ у зоны, якія мяжуюць з суседнімі дзяржавамі[52] .

Мясцовыя назіральнікі прысутнічалі на 90% ўчасткаў для галасавання, якія назіраліся, аднак шмат з іх практыкавалі пасіўны падыход да сваёй працы. Пры гэтым назіральнікі паведамілі, што ў Магілёве ў шэрагу выпадкаў мясцовым назіральнікам было адмоўлена ў праве падаць скаргу, а яшчэ ў адным выпадку назіральнік быў выдалены з памяшкання ўчастка для галасавання пры спробе зафіксаваць сваю скаргу.

Неўпаўнаважаныя асобы заўважаліся на 8% наведаных выбарчых участкаў і на 3% участкаў яны давалі УВК указанні па яе працы. Часцяком гэтыя людзі з'яўляліся службоўцамі мясцовых выканаўчых камітэтаў[53]. Часта ў памяшканнях выбарчых участкаў адзначалася прысутнасць супрацоўнікаў міліцыі, МНС і службы пажарнай

---

[50] Гэта было адзначана на 12 працэнтах выбарчых участкаў, наведаных да часу зачынення ўчасткаў для галасавання.

[51] Гэта адзначалася ў 22 працэнтах справаздач, ахопліваўшых назіранне за этапам галасавання.

[52] Тым не менш, назіральнікам было адмоўлена ў доступе на выбарчы ўчастак, створаны ў воінскай частцы (участак №29 у Аршанскім раёне), і яшчэ адзін у шпіталі КДБ (участак №32 у Першамайскім раёне).

[53] Напрыклад, на ўчастку № 68 у Рэчыцкім раёне, участку №3 у Магілёўскім раёне, участку №10 у Кобрынскім раёне, участку №63 у Пінскім раёне і ўчастку №11 у Любаньскім раёне. У шэрагу выпадкаў асобы, якія звалі сябе назіральнікамі, кіравалі працай УВК, напрыклад, на ўчастку № 39 у Гродзенскім раёне.

бяспекі. Некаторыя назіральнікі паведамілі, што склалася ўражанне, што супрацоўнікі міліцыі кантралявалі працэс галасавання і часта аддавалі УВК указанні[54].

Нягледзячы на тое, што ацэнкі правядзення галасавання ў дзень выбараў былі ўвогуле станоўчымі ў 90 працэнтах справаздач аб назіранні, у 10% справаздач дадзены працэс атрымаў негатыўную ацэнку. Дадзены паказчык вар'іраваўся ад 7% па Мінскай вобласці да 16% па Гомельскай вобласці. Прытым, што сур'ёзныя парушэнні фіксаваліся рэдка, значныя недахопы былі наступнымі:

- Пры адкрыцці выбарчых участкаў «скрыня для датэрміновага галасавання» не знаходзілася ў полі зроку, як гэта патрабуецца па законе (36 працэнтаў назіранняў). У шэрагу выпадкаў скрыні не былі зачыненыя належным чынам (7 працэнтаў назіранняў);
- На некаторых участках для галасавання адзначалася прысутнасць агітацыйных матэрыялаў або вядзенне агітацыйнай дзейнасці, галоўным чынам, у падтрымку А.Лукашэнкі або кампаніі «за Беларусь» (6% назіранняў);
- На некаторых з наведаных участкаў не былі вывешаны афіцыйныя плакаты з інфармацыяй аб кандыдатах (7% назіранняў);
- Некалькі відавочна ідэнтычных роспісаў у спісах выбаршчыкаў (13% назіранняў)[55];
- Выбаршчыкі не заўсёды рабілі адзнаку ў сваім бюлетэні таемна (8 працэнтаў назіранняў);
- Назіральнікі адзначалі, што некаторыя асобы паказвалі свой запоўнены бюлетэнь да апускання яго ў скрыню іншым асобам (5 працэнтаў назіранняў);
- «Групавое галасаванне», калі ў кабіне для галасавання адначасова знаходзіцца больш за адну асобу, было зафіксавана на 16 % участкаў для галасавання. Часцей гэта фіксавалася ў сельскай мясцовасці (22 працэнта), чым у гарадах (10%);
- Скрыні для галасавання не былі апячатаныя належным чынам (7 працэнтаў назіранняў);
- У шэрагу выпадкаў выбаршчыкі атрымоўвалі і апускалі ў скрыню больш аднаго бюлетэня[56], або неаднаразова вярталіся, каб прагаласаваць ізноў[57]; і
- У некаторых выпадках на выбаршчыкаў аказваўся ціск з мэтай паўплываць на іх выбар[58].

Вялікая колькасць выбаршчыкаў прагаласавала па-за памяшканнямі выбарчых участкаў, скарыстаўшыся пераноснымі скрынямі для галасавання. Па інфармацыі, прадастаўленай назіральнікам участковымі камісіямі, на 29 працэнтах выбарчых участкаў з выкарыстаннем пераносных скрынь для галасавання прагаласавала звыш 10 працэнтаў выбаршчыкаў.

---

[54] У Мазыры адна група назіральнікаў паведаміла, што супрацоўнікі міліцыі, якія прысутнічалі на ўчастку, пагражалі іх мясцовым асістэнтам. У Глыбокім супрацоўнікі міліцыі перашкаджалі доступу назіральнікаў на некалькі выбарчых участкаў.

[55] У некаторых справаздачах паведамлялася аб ажно да 10 відавочна ідэнтычных роспісаў, прастаўленых на адной і той жа старонцы, напрыклад, на ўчастку № 19 у горадзе Мазыры.

[56] Напрыклад, на ўчастку №20 у горадзе Салігорску.

[57] Напрыклад, на ўчастку №105 у Фрунзенскім раёне.

[58] Напрыклад, на ўчастку №28 у Жлобінскім раёне супрацоўнік кіруючага звяна з мясцовага завода стаяў ля ўчастка для галасавання, правяраючы, ці прыйшлі прагаласаваць супрацоўнікі.

Пачынаючы з 11:00 дзве акрэдытаваных дзяржавай службы на працягу ўсяго дня рэгулярна аб'яўлялі вынікі двух апытанняў выбаршчыкаў на выхадзе з выбарчых участкаў (экзіт-полаў), што раней не з'яўлялася звычайнай практыкай. Апытанні нязменна аддавалі А.Лукашэнку звыш 80 працэнтаў галасоў. Па дадзеных ЦВК да заканчэння галасавання прагаласавала каля 92,6 працэнтаў грамадзян. Лічбы яўкі вар'іраваліся ад 85 працэнтаў у горадзе Мінску да звыш 95 працэнтаў па трох з сямі абласцей Беларусі.

## C. Падлік галасоў

Якасць выбарчага працэсу пагоршылася пры падліку галасоў, працэдура якога, па назіраннях, з'яўлялася надзвычай праблематычнай. Шмат ўчастковых камісій дрэнна арганізавалі падлік галасоў, а скаргі належным чынам не разглядалі. Назіральнікі далі негатыўную ацэнку працэсу падліку галасоў у 50 працэнтах сваіх справаздач, а палова груп назіральнікаў зрабілі выснову, што празрыстасць пры падліку галасоў варта ацаніць як «дрэнную» або «вельмі дрэнную». Падчас падліку большасць назіральнікаў была пазбаўлена магчымасці стаяць на досыць блізкай адлегласці, каб пераканацца ў празрыстым адпраўленні працэдур падліку галасоў. Каля 5% назіральнікаў паведамілі, што пры працэдуры падліку галасоў не былі забяспечаны самыя мінімальныя крытэры пэўнасці, тады як 47 працэнтаў не змаглі адказаць на пытанне аб падліку, галоўным чынам з прычыны таго, што назіраць за дадзеным працэсам яны проста не мелі магчымасці.

Часцяком працэдуры падліку галасоў не выконваліся, напрыклад, бюлетэні з розных скрынь (для датэрміновага галасавання, пераносных і стацыянарных) не падлічваліся асобна, як гэта патрабуецца па заканадаўстве. У шматлікіх выпадках падлік праводзіўся ў поўнай цішыні. У 70 працэнтах наведаных выбарчых участкаў члены камісій не аб'яўлялі колькасць галасоў, пададзеных за кожнага з кандыдатаў, да запаўнення пратаколаў. Неўпаўнаважаныя асобы прысутнічалі на 8% выбарчых участкаў, якія назіраліся, і зрэдку кіравалі працай участковых камісій.

На 17% ўчасткаў для галасавання, якія назіраліся, участковыя камісіі адчувалі цяжкасці пры складанні пратаколаў аб выніках галасавання, а на 8% участкаў адносна падліку галасоў ва ўчастковыя камісіі была пададзена афіцыйная скарга. Назіральнікі паведамілі аб шэрагу выпадкаў выпраўлення вынікаў або іх занясення алоўкам[59]. На выбарчым участку №40 у Савецкім раёне старшыня УВК прыстрашыў членаў УВК звальненнем са сталага месца працы за адмову падпісаць раней выпраўлены ім пратакол.

## D. Апрацоўка вынікаў галасавання

Выбарчым кодэксам прадугледжана, што вынікі галасавання вывешваюцца для ўсеагульнага азнаямлення ў памяшканні выбарчага ўчастка. Тым не менш, само па сабе дадзенае палажэнне не гарантуе неабходнай ступені празрыстасці падчас сумавання вынікаў і пасля яго завяршэння. Не існуе ніякіх палажэнняў заканадаўства, якія б забяспечвалі ўдзельнікам выбараў магчымасць прасачыць за ходам апрацоўкі вынікаў ад выбарчых участкаў да цэнтральнага ўзроўня, што яшчэ больш зніжае ступень

[59] Напрыклад, на выбарчым участку №55 у Першамайскім раёне і ўчастку №64 у Пінскім раёне назіральнікі адзначылі, што УВК уносілі змены ў пратакол. На ўчастку №26 у Віцебскім раёне члены УВК падпісалі пратакол да падліку галасоў.

празрыстасці дадзенага працэсу. Заканадаўства не надзяляе назіральнікаў правам атрымаць афіцыйную копію пратакола аб выніках галасавання. Кодэксам не прадугледжваецца апублікаванне сумаваных дадзеных па выніках галасавання выбарчымі камісіямі на ўсіх узроўнях. Прынцыпова важна, што нягледзячы на права назіральнікаў наведваць паседжанні выбарчых камісій, прысутнасць назіральнікаў у ТВК пры апрацоўцы вынікаў не гарантуецца, бо ЦВК зыходзіць з таго, што ТВК пры атрыманні матэрыялаў па выбарах і пратаколаў аб выніках галасавання з УВК не знаходзяцца на паседжанні.[60]

Нягледзячы на запэўненні многіх ТВК напярэдадні выбараў аб тым, што назіральнікі змогуць сачыць за сумаваннем імі вынікаў па выбарчых участках, 39 працэнтаў назіральнікаў сутыкнуліся з абмежаваннямі або нават перашкодамі пры спробе сабраць інфармацыю аб дадзеным этапе працэсу, у тым ліку атрымаўшы адмову ў дазволе ўвайсці ў памяшканне ТВК. Гэта абмежавала магчымасць назіральнікаў даць ацэнку таму, ці былі вынікі падлічаны і паведамлены тэрытарыяльнымі камісіямі сумленна. Гэтыя і іншыя недахопы Выбарчага кодэкса сур'ёзным чынам падрываюць празрыстасць дадзенага працэсу. Назіральнікі, якія сачылі за дадзенай стадыяй выбарчага працэсу, ацанілі празрыстасць пры апрацоўцы вынікаў як «дрэнную» або «вельмі дрэнную» (43 працэнта).

## XV. ЗАЯВЫ І СКАРГІ, ЗРОБЛЕНЫЯ ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ

Прававой базай для правядзення прэзідэнцкіх выбараў у Рэспубліцы Беларусь не забяспечваецца эфектыўнага механізма прававой абароны ад электаральных злоўжыванняў. У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам (артыкул 79) патрабаванні аб прызнанні вынікаў выбараў несапраўднымі павінны быць пададзены ў Цэнтрвыбаркам «не пазней чым на наступны дзень пасля выбараў» [61]. Разгляд патрабавання аб прызнанні вынікаў прэзідэнцкіх выбараў несапраўднымі знаходзіцца ў выключнай кампетэнцыі Цэнтрвыбаркама. Тэрмін падачы ў ЦВК патрабавання аб прызнанні вынікаў выбараў несапраўднымі з'яўляецца неапраўдана кароткім, з прычыны чаго дадзенае права на абскарджанне становіцца нядзейсным[62].

Абскарджанне рашэння ЦВК аб прызнанні выбараў «сапраўднымі» у Вярхоўным судзе з’яўляецца недапушчальным. Адсутнасць палажэння, якое б дазваляла правесці

60 Цэнтрвыбаркам паведаміў, што рашэнне аб тым, ці дазваляць назіральнікам сачыць за працэсам апрацоўкі вынікаў у ТВК, прымаецца па меркаванню старшыні дадзенай ТВК.

61 Артыкулам 79 прадугледжана, што «Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у цэлым па рэспубліцы або па асобных участках для галасавання, раёнах, гарадах, раёнах у гарадах, абласцях, гораду Мінску могуць быць прызнаны несапраўднымі з-за дапушчаных падчас выбараў або пры падліку галасоў парушэнняў патрабаванняў гэтага Кодэкса, калі яны паўплывалі на вынікі выбараў у цэлым па рэспубліцы. Рашэнне аб прызнанні выбараў несапраўднымі прымаецца Цэнтральнай камісіяй. Скарга аб такім парушэнні падаецца ў Цэнтральную камісію не пазней чым на наступны дзень пасля выбараў. Рашэнне Цэнтральнай камісіі можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу 10 дзён. Права абскарджання рашэння аб прызнанні выбараў несапраўднымі належыць кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь».

62 На працягу аднаго дня практычна немагчыма сабраць дастатковых доказаў у пацверджанне таго, што былі дапушчаныя парушэнні, «якія паўплывалі на вынікі выбараў у цэлым па рэспубліцы». Для параўнання, на зацвярджэнне пратаколаў аб выніках галасавання ТВК адводзіцца 3 дні, а абласныя ТВК павінны накіраваць іх у ЦВК не пазней, чым праз чатыры дні пасля выбараў. ЦВК павінна скласці свой пратакол аб выніках выбараў не пазней, чым праз дзесяць дзён пасля выбараў і мае яшчэ тры дні для іх публікацыі.

юрыдычны перагляд рашэння ЦВК адносна вынікаў выбараў з'яўляецца значным недахопам у выбарчым працэсе, бо гэта азначае адсутнасць механізму юрыдычнага аспрэчвання сапраўднасці вынікаў выбараў.

23 сакавіка ЦВК правяла паседжанне для разгляду заяў і скарг. На дадзеным паседжанні ЦВК разгледзела скаргі А.Казуліна і А.Мілінкевіча з патрабаваннем прызнаць выбары несапраўднымі[63]. Абедзве заявы былі адхіленыя. ЦВК адмовіла назіральнікам МНВ БДІПЧ/АБСЕ ў праве прысутнічаць на дадзеным паседжанні.

А.Мілінкевіч і А.Казулін спрабавалі аспрэчыць вынікі выбараў у Вярхоўным судзе. 5 красавіка суд адхіліў дадзеныя заявы.

## XVI. ПАДЗЕІ ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ

Увечары дня выбараў у цэнтры Мінска на Кастрычніцкай плошчы сабралася каля 10000 чалавек. А.Казулін і А.Мілінкевіч, якія звярнуліся да прыйшоўшых, заявілі, што выбары былі сфальсіфікаваныя і не адлюстроўваюць волевыяўлення народа. Яны запатрабавалі правядзення дэмакратычных выбараў 16 ліпеня 2006 года. Нягледзячы на тое, што першыя пяць дзён улады дазвалялі працягваць дадзеную акцыю, супрацоўнікі міліцыі сістэматычна затрымоўвалі пратэстантаў пры сыходзе з месца правядзення мітынга і вяртанні на яго і, як паведамлялася, перашкаджалі людзям прыносіць пратэстантам прадукты, цёплую вопратку і коўдры. Нягледзячы ні на што, шмат ўдзельнікаў акцыі працягвалі пратэставаць, пакуль самай раніцай 24 сакавіка супрацоўнікі міліцыі не разагналі дэманстрацыю і не арыштавалі застаўшыхся яе ўдзельнікаў.

У адказ на акцыі пратэсту і заклік апазіцыі да правядзення новых выбараў злоўжыванні дзяржаўнай уладай узмацніліся, а асноўныя свабоды і грамадзянскія і палітычныя правы парушаліся ўжо сістэматычна. У сувязі з масавымі пратэстамі было затрымана ад 500 да 1000 чалавек, у тым ліку А.Казулін і блізкі член сям'і А.Мілінкевіча. 30 сакавіка А.Казуліну прад'явілі абвінавачванні па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса, якія прадугледжваюць пакаранні ажно да шасці гадоў пазбаўлення волі. Як паведаміў яго адвакат, Казулін знаходзіўся ў дрэнным стане здароўя па прычыне збіванняў супрацоўнікамі міліцыі. На момант завяршэння дадзенай справаздачы А.Казулін усё яшчэ знаходзіўся пад вартай.

Толькі за адзін дзень 27 сакавіка суды Мінска вынеслі абвінаваўчыя заключэнні ў адносінах да звыш 200 чалавек. Ва многіх выпадках адказчыкам было адмоўлена ў праве на прадстаўніка іх інтарэсаў у судзе, а рашэнні судоў галоўным чынам засноўваліся на сведчаннях міліцыянераў, якія ажыццяўлялі арышт, што выступілі ў якасці сведак. У органах пракуратуры пацвердзілі, што было арыштавана і затрымана звыш 500 чалавек, у тым ліку 21 замежны грамадзянін, з якіх у адносінах да 392 былі вынесеныя абвінаваўчыя заключэнні.

Органы міліцыі, суды і шпіталі ўпарта адмаўляліся паведаміць імёны затрыманых, адказчыкаў і ахвяр гвалту. Гэта прывяло сваякоў зніклых у стан блізкі да панікі, калі яны бегалі ад аднаго аддзялення міліцыі да другога, а пазней, калі прымальнікі-размеркавальнікі ў Мінску перапоўніліся, ездзілі з горада ў горад у пошуку інфармацыі.

[63] Была адхілена і аналагічная скарга, пададзеная Беларускім Хельсінскім камітэтам.

Выбітны актывіст адной з НУА па вызваленні з турмы заявіў, што падчас зняволення падвяргаўся жорсткім збіванням і іншым формам жорсткага абыходжання.

Склалася ўражанне, што ўлады мэтанакіравана арыштоўвалі журналістаў. 30 сакавіка Беларуская асацыяцыя журналістаў паведаміла, што падчас разгону акцый пратэсту было затрымана, арыштавана або панесла пакаранні 44 журналісты, у тым ліку 13 замежных грамадзян.

## XVII. ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ

Паводле афіцыйна абвешчаных ЦВК канчатковых вынікаў у выбарах прынялі ўдзел 6630653 чалавекі з 7 153 978, якія маюць права голаса.

Вынікі выбараў па абласцях (паводле дадзеных з вэб-сайта Цэнтрвыбаркама)[64]:

| | Брэсц-кая | Віцеб-ская | Гомель-ская | Гродзен-ская | Мінская вобласць | Магілёў-ская | горад Мінск | Разам: |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гайдукевіч | 1,9 | 5,3 | 3,2 | 2,1 | 2,0 | 4,9 | 5,1 | 3,5 |
| Казулін | 2,1 | 2,2 | 1,9 | 1,9 | 2,5 | 1,6 | 3,9 | 2,3 |
| Лукашэнка | 82,6 | 82,9 | 90,3 | 83,8 | 81,0 | 88,5 | 70,7 | 82,6 |
| Мілінкевіч | 5,8 | 4,5 | 3,1 | 6,3 | 7,3 | 4,0 | 10,1 | 6,0 |

## XVIII. РЭКАМЕНДАЦЫІ

Ніжэйследуючыя рэкамендацыі прапаноўваюцца ўладам Беларусі з мэтай аказання садзейнічання ў паляпшэнні выбарчага працэсу і выкананні звязаных з выбарамі абавязальніцтваў у рамках АБСЕ. Разам з тым, для таго, каб дадзеныя рэкамендацыі якім-небудзь істотным чынам паўплывалі на прывядзенне выбараў у Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасць з абавязальніцтвамі ў рамках АБСЕ, запатрабуецца прадэманстраваць адпаведную ступень палітычнай волі.

Асабліва для гэтага запатрабуецца безумоўная прыхільнасць палітычнаму плюралізму, у тым ліку павазе да асноўных грамадзянскіх і палітычных правоў чалавека, такіх як свабода слова, аб'яднанняў і сходаў, каб у поўнай меры быў выкананы параграф 6 Капенгагенскага дакумента АБСЕ 1990 года.

### A. ПРАВАВАЯ БАЗА

- Варта правесці ўсебаковую рэвізію Выбарчага кодэкса на прадмет надання працэдурным правілам большай выразнасці, празрыстасці і аднастайнасці.
- Варта ўнесці змены ва ўсе акты заканадаўства, якія маюць дачыненне да выбараў, улічваючы Выбарчы кодэкс і ўсе адпаведныя нарматыўна-прававыя

[64] Па стане на 6 чэрвеня 2006 года на вэб-сайце Цэнтрвыбаркама была размешчана толькі папярэдняя інфармацыя аб выніках галасавання без указання колькасці несапраўдных бюлетэняў і колькасці прагаласаваўшых «супраць усіх».

акты па забеспячэнні грамадскага правапарадку для іх уніфікацыі з абавязальніцтвамі ў рамках АБСЕ і гарманізацыі паміж сабою.

- Варта адмовіцца ад ужывання дзеючага заканадаўства палітычна выбарчым або адвольным спосабам. Ім павінна забараняцца дыскрымінацыя супраць палітычнай апазіцыі з боку дзяржаўных органаў і павінны гарантавацца дзейсныя сродкі абароны ад дыскрымінацыі ўсім асобам.
- Варта ўнесці папраўкі ў дзеючае заканадаўства, з тым, каб удзельнікі выбараў, у прыватнасці кандыдаты і выбаршчыкі, валодалі дзейснымі сродкамі судовага аспрэчвання ўсіх звязаных з выбарамі рашэнняў адміністрацыйнага характару, прымаемых ЦВК, ТВК, УВК і іншымі дзяржаўнымі і мясцовымі органамі.
- Варта скасаваць крымінальную адказнасць па абвінавачванню ў паклёпе і абразе, або прынамсі, не злоўжываць яе выкарыстаннем для запалохвання выбаршчыкаў і кандыдатаў.

## B. Прынцыпы галасавання

- Варта разгледзець магчымасць скасавання патрабавання 50-працэнтнай яўкі, асабліва ў дачыненні да другога тура выбараў (Выбарчы кодэкс, артыкул 80) з прычыны таго, што гэта можа выліцца ў цыкл неадбыўшыхся выбараў і правакаваць электаральныя злоўжыванні.
- Варта разгледзець магчымасць скасавання палажэнняў, дапускаючых галасаванне «супраць усіх», з прычыны таго, што сутнасць выбараў заключаецца ў прадстаўніцтве, і, такім чынам, магчымасць прагаласаваць «супраць усіх» цяжка суаднесці са стандартным вызначэннем прадстаўнічай дэмакратыі.

## C. Арганізацыя і правядзенне выбараў

- Варта ўнесці папраўкі ў Выбарчы кодэкс для забеспячэння даверу да арганізацыі і правядзення выбараў у цэлым, у прыватнасці пасродкам усёабдымнага плюралістычнага прадстаўніцтва ў складзе выбарчых камісій на ўсіх узроўнях. Дадзены прынцып не павінен абмяжоўвацца толькі правам на вылучэнне ў склад камісій, а гарантаваць рэальнае прадстаўніцтва, калі прыярытэт аддаецца прадстаўнікам партый і кандыдатаў. Фінансуемыя за кошт дзяржбюджэту працоўныя калектывы не павінны мець ніякага дачынення да арганізацыі і правядзення выбараў.
- У выніку перагляду выбарчага заканадаўства варта забяспечыць незалежнасць сістэмы выбарчых камісій ад органаў выканаўчай улады, у тым ліку пазбавіць органы дзяржаўнай адміністрацыі выключнага права прызначаць склад выбарчых камісій на адпаведных узроўнях.
- Усё рашэнні выбарчых камісій варта прымаць на афіцыйных паседжаннях і неадкладна апублікоўваць. Прынящце рашэнняў на неафіцыйных сустрэчах не адказвае прынцыпу празрыстасці і падсправаздачнасці працы выбарчых органаў і павінна стаць недапушчальным.
- Варта загадзя аб'яўляць аб усіх паседжаннях выбарчых камісій, каб члены камісій валодалі поўнай інфармацыяй аб пытаннях, якія стаяць на павестцы дня, а ўпаўнаважаныя назіральнікі былі апавешчаны аб іх правядзенні і маглі іх наведаць.

- Выбарчым кодэксам павінна быць прама абумоўлена, што ўсе дакументы па выбарах, улічваючы рашэнні камісій, павінны неадкладна прадастаўляцца для ўсеагульнага азнаямлення, асабліва прадстаўнікам кандыдатаў і партый і назіральнікам за выбарамі.
- Выбарчым кодэксам павінна выразна вызначацца колькасць бюлетэняў, якія друкуюцца на кожныя выбары. Прадстаўнікі кандыдатаў і ўсе акрэдытаваныя назіральнікі павінны мець права назіраць і атрымоўваць інфармацыю аб вырабе бюлетэняў.
- Варта змяніць дызайн пячатак УВК, каб яны былі індывідуальнымі.
- Варта найсур'ёзным чынам разбіраць скаргі аб наўмысных парушэннях Выбарчага кодэкса членамі выбарчых камісій і ўжываць меры крымінальнай адказнасці.

## D. Рэгістрацыя кандыдатаў

- Патэнцыйных кандыдатаў у Прэзідэнты варта надзяліць правам прызначаць сваіх прадстаўнікоў для назірання за працэдурай праверкі подпісаў за вылучэнне, пададзеных ініцыятыўнымі групамі ўсіх патэнцыйных кандыдатаў, якая праводзіцца тэрытарыяльнымі камісіямі.
- Патрабаванне аб падачы дэкларацыі аб даходах і маёмасці павінна перш за ўсё прад'яўляцца да самога кандыдата, не распаўсюджваючыся на іншых асоб акрамя кандыдата, калі яно ўжо становіцца празмерным. Варта прадугледзець палажэнне аб дапушчальнасці выпраўлення памылак у такіх дакументах.
- Пасля рэгістрацыі кандыдаты могуць чакаць ажыццяўлення сваёй дзейнасці ў прадказальных абставінах, непадуладных дапускаючым неадназначнае тлумачэнне правілам і магчымым неадпаведным санкцыям.
- Варта паменшыць колькасць подпісаў за вылучэнне, неабходных для рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты. У адпаведнасці з перадавой практыкай[65] колькасць такіх подпісаў не павінна перавышаць аднаго працэнта ад колькасці зарэгістраваных выбаршчыкаў.

## E. Рэгістрацыя выбаршчыкаў

- Варта стварыць агульнанацыянальны цэнтралізаваны рэестр выбаршчыкаў з крытэрамі, дастатковымі для асабістай ідэнтыфікацыі кожнага выбаршчыка. Рэестр павінен весціся і абнаўляцца на сталай аснове, а не толькі ўдакладняцца перад чарговымі выбарамі.
- Варта ў заканадаўчым парадку растлумачыць абавязкі ўсіх органаў, якія паведамляюць дадзеныя для занясення ў рэестр выбаршчыкаў, і забяспечыць гарантыі збору і захоўвання дадзеных аб сталым месцы жыхарства.
- Пасля складання рэестр выбаршчыкаў павінен падтрымліваць крыжаваныя спасылкі дадзеных, што абмяжуе магчымасць шматразовых запісаў. Рэкамендуецца, каб у пратакол УВК уносілася колькасць грамадзян, якія рэгіструюцца для галасавання ў дзень або дні выбараў.
- Упаўнаважаныя прадстаўнікі кандыдатаў павінны мець права знаёміцца з рэестрам выбаршчыкаў, запытваць і атрымоўваць інфармацыю, захоўваючы пры гэтым канфідэнцыяльнасць дадзеных.

---

[65] Гл. «Кодэкс практыкі, якая склалася ў пытаннях выбараў» Венецыянскай камісіі Савета Еўропы.

- Спісы выбаршчыкаў павінны быць адкрыты для поўнага ўсеагульнага азнаямлення ў УВК, што з'яўляецца не толькі спосабам праверкі іх дакладнасці, але і мерай па ўмацаванню даверу.
- Колькасць выбаршчыкаў у папярэдніх спісах варта апублікаваць як мінімум у якасці сумарных лічбаў па кожнай з ТВК. У заканадаўчым парадку варта ўсталяваць тэрмін завяршэння ўдакладнення спісаў выбаршчыкаў напярэдадні дня выбараў, а таксама апублікаваць удакладненыя дадзеныя па колькасці выбаршчыкаў, занесеных у спісы.

## F. АГІТАЦЫЯ І ФІНАНСАВАННЕ КАМПАНІІ

- Варта перагледзець палажэнні аб парадку вядзення агітацыі, каб гарантаваць доступ кандыдатаў да выбаршчыкаў. Агітацыйныя мітынгі не павінны падпадаць пад абмежаванні Закона «Аб масавых мерапрыемствах», а парадак іх правядзення павінен рэгламентавацца выключна Выбарчым кодэксам.
- Грамадзянам павінна быць дазволена праводзіць сустрэчы для абмеркавання палітычных пытанняў у жылых памяшканнях без усякіх перашкод з боку дзяржаўных органаў.
- Варта скасаваць палажэнні заканадаўства, якія ўсталёўваюць адказнасць кандыдатаў за парушэнні, дапушчаныя іх прыхільнікамі.
- Варта перагледзець палажэнні аб парадку фінансавання перадвыбарнай кампаніі. Кандыдаты павінны мець права расходваць на сваю кампанію значна больш належную суму. Варта ўнесці папраўкі ў артыкул 48 Кодэкса, дазволіўшы прыватным асобам, у тым ліку і самім кандыдатам, аказваць матэрыяльную дапамогу адной або некалькім перадвыбарным кампаніям асобных кандыдатаў. Пры гэтым варта забяспечыць поўную празрыстасць атрымання і расходвання сродкаў на працягу ўсяго перыяду выбараў.
- Кандыдаты павінны мець магчымасць свабодна займацца рознымі формамі агітацыі, напрыклад, размяшчаць у СМІ платныя рэкламныя матэрыялы і карыстацца плошчай на рэкламных шчытах, якая прадастаўляецца ўсім кандыдатам/партыям на роўнай аснове.
- Змест агітацыйных матэрыялаў не павінен падвяргацца цэнзуры. Акрамя таго, органы міліцыі не павінны канфіскоўваць матэрыялы, якія па іх падазронах не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства аб выбарах акрамя як выконваючы рашэнне суду.
- Палітычная агітацыя не павінна выбарча абмяжоўвацца афіцыйным перыядам перадвыбарнай агітацыі, бо гэта неапраўдана абмяжоўвае правы грамадзян на свабоду слова, аб'яднанняў і мірных сходаў.
- Правядзенне агітацыйных мерапрыемстваў на дзяржаўных прадпрыемствах, у дзяржустановах і ВНУ не павінна санкцыянавацца выбарча.

## G. СМІ

- Змест праграмных матэрыялаў кандыдатаў у дзяржаўных СМІ не павінен падвяргацца цэнзуры. Кандыдатам, у рамках дзеючага заканадаўства, павінна быць прадастаўлена магчымасць выбару мадальнасці бясплатнага эфірнага часу і друкаванай плошчы.

- У Выбарчы кодэкс варта ўключыць палажэнні аб забеспячэнні роўнага доступу кандыдатаў і палітычных партый да ўсіх звязаных з выбарчай тэматыкай перадач, улічваючы навінавыя і іншыя інфармацыйныя праграмы.
- Дзяржаўным СМІ варта ўстрымоўвацца ад агітацыі ў падтрымку або супраць любых палітычных альтэрнатыў і праяўляць бесстароннасць у асвятленні выбарчай кампаніі і палітычных падзей. Ім варта забяспечыць бесперашкодны доступ да СМІ на недыскрымінацыйнай аснове ўсім палітычным структурам і дзеячам, прымаючым удзел у выбарчым працэсе.
- Варта паважаць права ўсіх СМІ асвятляць звязаныя з выбарамі падзеі, у тым ліку агітацыйныя мерапрыемствы, браць інтэрв'ю ў кандыдатаў і палітыкаў, арганізоўваць палітычныя дэбаты, трансляваць праграмы палітычнага зместу, і г.д..
- СМІ варта праяўляць паслядоўнасць, праводзячы размежаванне паміж дзейнасцю Прэзідэнта і яго ж дзейнасцю ў якасці кандыдата. Любы дадатковы аб'ём асвятлення дзеючага Прэзідэнта, які займае свой пост у перыяд выбарчай кампаніі, не павінен прыводзіць да недапушчальнай няроўнасці супернікаў на выбарах.
- СМІ павінны спрыяць правядзенню тэледэбатаў паміж кандыдатамі, або, калі яны не жадаюць удзельнічаць самі, паміж іх прадстаўнікамі або прыхільнікамі.

## H. Заявы і скаргі

- Варта ўнесці папраўкі ў Выбарчы кодэкс, каб (1) выкласці выразную, зразумелую, *адзіную па сваім прызначэнні* працэдуру абскарджання з іерархічнай структурай, якая вызначае ролі выбарчых камісій усіх узроўняў пры вырашэнні спрэчак, звязаных з выбарамі, (2) усе скаргі і заявы, пададзеныя ў выбарчыя камісіі на ўсіх узроўнях, у абавязковым парадку разглядаліся падчас адкрытых публічных слуханняў, а рашэнні па іх выносіліся камісіямі калегіяльна, і (3) зацвердзіць адзіную працэдуру абскарджання ў дачыненні да ўсіх рашэнняў, дзеянняў, а таксама бяздзейнасці ЦВК, якія можна аспрэчыць у Вярхоўным судзе[66].
- Варта ўнесці папраўкі ў артыкул 79, каб прадаставіць кандыдатам права аспрэчваць усе рашэнні ЦВК адносна вынікаў выбараў у Вярхоўным судзе. Акрамя таго, дадзеным артыкулам павінны ўсталёўвацца больш рэалістычныя тэрміны падачы заяў у ЦВК з патрабаваннем аб прызнанні вынікаў выбараў несапраўднымі.

## I. Галасаванне

- Варта ўнесці папраўкі ў артыкул 53 Выбарчага кодэкса, каб абмежаваць магчымасць датэрміновага галасавання патрабаваннем аб накіраванні папярэдняй просьбы, абгрунтаванай важлівымі прычынамі, і цалкам забяспечыць надзейнасць, празрыстасць і падсправаздачнасць працэдуры датэрміновага галасавання.

---

66 Для выканання дадзенай рэкамендацыі можа запатрабавацца ўнясенне папраўак і ў адпаведныя артыкулы Канстытуцыі, а таксама іншых заканадаўчых актаў, якія рэгламентуюць паўнамоцтвы Вярхоўнага суду.

- Скрыні для галасавання, а таксама пячаткі на скрынях павінны адказваць мінімальным крытэрам якасці, якія гарантуюць немагчымасць маніпуляцый з іх змесцівам на любой са стадый выбарчага працэсу.
- Лічбы яўкі па датэрміновым галасаванні (у тым ліку колькасць прагаласаваўшых ў кожны з яго дзён), галасаванні па месцы знаходжання выбаршчыкаў і звычайным галасаванні варта ўсталёўваць паасобна і занасіць у выніковы пратакол аб выніках галасавання выбарчым камісіям на ўсіх узроўнях. Пасля таго, як гэта будзе зроблена падчас падліку галасоў на выбарчым участку, бюлетэні з усіх трох скрынь варта змяшаць і затым зрабіць падлік.
- Цэнтрвыбаркаму варта ўзмацніць меры па забеспячэнні таямніцы галасавання і прадухіленні падманных дзеянняў пры галасаванні па месцы знаходжання выбаршчыкаў. Пераносныя скрыні для галасавання павінны прыносіцца толькі тым выбаршчыкам, якія выказалі просьбу аб аказанні дадзенай паслугі, а колькасць бюлетэняў, якія выдаюцца для гэтых мэт, - адпавядаць колькасці такіх выбаршчыкаў.
- ЦВК варта прыняць неабходныя меры па прадухіленні адкрытага галасавання і групавога галасавання. Цэнтрвыбаркаму таксама варта праводзіць адукацыйную працу з выбаршчыкамі па пытанні абавязку галасаваць таемна.
- Пасродкам падрабязных палажэнняў Выбарчага кодэкса варта прама абмежаваць доступ да УВК і камісій больш высокіх узроўняў неўпаўнаважаных асоб, асабліва прадстаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі на працягу галасавання і падліку галасоў. Выбарчым кодэксам павінны вычарпальным чынам пералічвацца асобы, упаўнаважаныя прысутнічаць падчас дадзеных працэдур.
- Варта ўнесці змены ў адпаведнае заканадаўства, з тым, каб супрацоўнікі міліцыі прысутнічалі на выбарчым участку толькі пры парушэннях грамадскага парадку па адпаведнай просьбе УВК.
- Абвяшчэнне вынікаў апытанняў на выхадзе з выбарчых ўчасткаў (экзіт-полаў) варта забараніць да заканчэння галасавання.

## J. ПАДЛІК ГАЛАСОЎ І АПРАЦОЎКА ВЫНІКАЎ ГАЛАСАВАННЯ

- Колькасць атрыманых кожнай УВК бюлетэняў і колькасць прагаласаваўшых выбаршчыкаў (якая адпавядае колькасці роспісаў у спісе выбаршчыкаў) варта ўносіць у выніковы пратакол да адкрыцця скрынь для галасавання.
- Патрабуюцца дадатковыя меры па забеспячэнні большай празрыстасці і надзейнасці працэсу падліку галасоў. Аб'ява ўслых выбару выбаршчыкаў па кожным бюлетэні і агульнай лічбы галасоў, аддадзеных за кожнага кандыдата, і складанне бюлетэняў пачкамі так, каб назіральнікі бачылі зробленую выбаршчыкам адзнаку, з'яўляюцца мінімальнымі з магчымых мер.
- Да сумарных вынікаў галасавання па абласцях і ў цэлым па краіне павінны прыкладацца працоўныя пратаколы з дэталізацыяй вынікаў на ўзроўні выбарчых участкаў, што дазволіць любому грамадзяніну або назіральніку прасачыць вынікі выбараў ад выбарчых участкаў да больш высокіх узроўняў.
- Падрабязныя дадзеныя аб выніках галасавання па выбарчых участках варта размяшчаць на вэб-сайце Цэнтрвыбаркама адразу пасля іх зацвярджэння на ўзроўні тэрытарыяльных камісій.

## K. НАЗІРАННЕ ЗА ВЫБАРАМІ

- Варта ўнесці папраўкі ў Выбарчы кодэкс або прыняць асобныя пастановы адносна: (1) сродкаў абароны, якімі валодаюць мясцовыя назіральнікі ў выпадку адмовы ім у іх правах у працэсе назірання; (2) дазволу міжнародным і мясцовым назіральнікам весці маніторынг працэсаў галасавання, падліку галасоў і апрацоўкі вынікаў такім чынам, які дазваляе назіральнікам у поўнай меры ацаніць правільнасць іх правядзення; (3) абавязковага задавальнення просьбаў усіх назіральнікаў аб прадастаўленні засведчаных копій афіцыйных пратаколаў аб выніках галасавання на ўсіх узроўнях;
- Назіральнікаў варта надзяліць законным правам сачыць за сумаваннем вынікаў па выбарчых участках тэрытарыяльнымі камісіямі, а таксама запытваць і атрымоўваць інфармацыю аб выніках выбараў на ўзроўні ўчасткаў адразу пасля іх паступлення ў ТВК.
- Групы незалежных мясцовых назіральнікаў павінны мець магчымасць праходзіць рэгістрацыю і ажыццяўляць сваю дзейнасць ва ўмовах, якія адпавядаюць міжнародным стандартам свабоды аб'яднанняў. Акрэдытацыя груп незалежных мясцовых назіральнікаў пры Цэнтрвыбаркаме, якая праводзіцца на недыскрымінацыйнай аснове, павінна забяспечваць поўны доступ да працы выбарчых камісій на ўсіх узроўнях.

## ІНФАРМАЦЫЯ АБ БДІПЧ/АБСЕ

Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) з'яўляецца асноўным інстытутам АБСЕ, закліканым аказваць дзяржавам-удзельніцам садзейнічанне ў «забеспячэнні поўнай павагі да правоў чалавека і асноўных свабод, прытрымліванні вяршэнства закона, развіцці дэмакратычных прынцыпаў і (…) пабудове, умацаванні і абароне дэмакратычных інстытутаў, а таксама развіцці талерантнасці ў маштабах усяго грамадства» (Хельсінкскі дакумент 1992 года).

БДІПЧ, размешчанае ў Варшаве (Польшча), было заснавана на Парыжскім саміце 1990 года пад назвай «Бюро па свабодных выбарах» і распачало сваю дзейнасць у маі 1991 года. Адзін год пазней, назва Бюро змянілася ў сувязі з пашырэннем яго мандата, у які ўвайшлі правы чалавека і дэмакратызацыя. Сёння ў штаце Бюро налічваецца больш за 100 спецыялістаў.

БДІПЧ з'яўляецца вядучай арганізацыяй у Еўропе ў сферы **назірання за выбарамі**. Бюро каардынуе і арганізоўвае накіраванне тысяч назіральнікаў штогадова для ацэнкі выбараў у рэгіёне АБСЕ наконт адпаведнасці нацыянальнаму заканадаўству і міжнародным стандартам. Яго ўнікальная методыка дазваляе правесці паглыблены аналіз усіх аспектаў выбарчага працэсу. Пасродкам рэалізацыі праектаў па аказанні садзейнічання БДІПЧ дапамагае дзяржавам-удзельніцам палепшыць выбарчую інфраструктуру.

Дзейнасць Бюро па **дэмакратызацыі** ахоплівае наступныя тэматычныя сферы: вяршэнства закона, грамадзянская супольнасць, свабода перамяшчэння і гендэрная роўнасць. Штогод БДІПЧ рэалізоўвае шэраг цэлевых праграм па садзейнічанню дзяржавам-удзельніцам у выкананні большага аб'ёму абавязальніцтваў у рамках АБСЕ і развіццю дэмакратычных структур.

БДІПЧ сочыць за выкананнем дзяржавамі-ўдзельніцамі абавязальніцтваў у рамках АБСЕ ў сферы чалавечага вымярэння і садзейнічае ў паляпшэнні абароны **правоў чалавека**. Бюро таксама штогадова арганізоўвае шэраг сустрэч, прысвечаных вывучэнню працэса выканання дзяржавамі-ўдзельніцамі абавязальніцтваў па АБСЕ ў сферы чалавечага вымярэння.

У рамках барацьбы за **цярплівасць і супраць дыскрымінацыі** БДІПЧ аказвае дзяржавам-удзельніцам падтрымку ў выкананні іх абавязальніцтваў па АБСЕ і актывізацыі іх барацьбы са злачынствамі на глебе нянавісці, успышкамі расізму, ксенафобіі, антысемітызму і іншымі формамі нецярплівасці. Дзейнасць БДІПЧ па забеспячэнню цярплівасці і недыскрымінацыйных адносінаў сканцэнтравана ў наступных абласцях: заканадаўства, навучанне па прывядзенні законаў у выкананне, правядзенне маніторынгу, падрыхтоўка справаздач і адсочванне адказнай рэакцыі на злачынствы і інцыдэнты на глебе гвалту, а таксама адукацыйныя мерапрыемствы па заахвочванню цярплівасці, павагі і ўзаемапаразумення.

БДІПЧ кансультуе дзяржавы-ўдзельніцы па пытаннях іх палітыкі ў дачыненні да народнасцяў **рома і сінці**. Бюро спрыяе развіццю патэнцыяла і ўзаемадзеянню абшчынаў рома і сінці і садзейнічае ўдзелу прадстаўнікоў рома і сінці ў органах улады. Бюро таксама служыць цэнтрам абмена інфармацыяй па пытаннях рома і сінці сярод нацыянальных і міжнародных структур.

Усё мерапрыемствы БДІПЧ праводзяцца ў цеснай каардынацыі і супрацоўніцтве з дзяржавамі-ўдзельніцамі АБСЕ, інстытутамі і палявымі місіямі АБСЕ, а таксама з іншымі міжнароднымі арганізацыямі.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць на вэб-сайце БДІПЧ (www.osce.org/odihr).